Ба 3698

Год выдавецтва VII.

# БЕЛАРУСКІ КАЛЕНДАР

## на 1916 год.

а 20 кап.

ЯК

05
34800 Ба 3698

Ґод выдавецтва VII.

# БЕЛАРУСКІ КАЛЕНДАР

## на 1916 год.

Б 3698 ба
Инв. 1953 г.
Бел. адддел 1934 г.
БССР Бібліятэка імені Леніна

ВІЛЬНЯ

## *КАЛЕНДАРНЫЕ ЗНАКІ.*

Перамены месяца адзначываюцца у календары гэткімі знакамі:

● —вечах

☽ —маладзік

○ —поуня

☾ —сход

25. II. 4. 2009

# Сьнежэнь — ЯНВАРЬ 31 дзень / STYCZEŃ 31 dzień — Śnieżeń

| С. с. | | Праваслаун. і Уніяц. сьв. | | N. st. | | Rymska-Katalickije św. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 19 | С. | Боніфаца | | 1 | S. | ***Nowy hod. Abr. P. Jez.*** |
| 20 | Н. | Ігната | | 2 | N. | Makara opata. |
| 21 | П. | Петра | | 3 | P. | Genowefy P. |
| 22 | У. | Анастасі | | 4 | U. | Tytusa B. |
| 23 | С. | Паула | ● | 5 | S. | Telesfora P. M. |
| 24 | Ч. | Эугэні | | 6 | Cz. | ***Treoh Karalou.*** |
| 25 | П. | **Нарадж. Езуса Хр.** | | 7 | P. | † Lucijana i Juljana M. |
| 26 | С. | М. Б Остробрамск. | | 8 | S. | Seweryna op. |
| 27 | Н. | Сьцепана I Муч. | | 9 | N. | *1 pa 3 Kar.* Marcyny P. M. |
| 28 | П. | Дарахвея | | 10 | P. | Agatona Pap. Wilhelma B. |
| 29 | У. | Тадэуша | | 11 | U. | Honoraty P. Hygina P. |
| 30 | С. | Анісі | ☽ | 12 | S. | Arkadja i Modesta M |
| 31 | Ч. | Малані | | 13 | Cz. | Weroniki i Glafiry P. |
| 1 | П. | Новы год 1916.Васіля | | 14 | P. | † Hilara B. W. D. K. |
| 2 | С. | Сыльвэстра | | 15 | S. | Pauła I Pustelnika |
| 3 | Н. | Малахвія | | 16 | N. | *2 pa 3 Kar.* ***Imień. Jezus*** |
| 4 | П. | Збор 70 вучняу Хр | | 17 | P. | Antoniaho Opata |
| 5 | У. | Пр. Міхея | | 18 | U. | Katedry św. Pietra |
| 6 | С. | Трох Каралёу | | 19 | S. | Henryka B. W. |
| 7 | Ч. | Саб. Яна Хрысьц. | ○ | 20 | Cz. | Fabijana P. W. |
| 8 | П. | Грыгора прп. | | 21 | P. | † Agnieszki P. M. |
| 9 | С. | Піліпа | | 22 | S. | Wincentaho M |
| 10 | Н. | Грыгора Біск | | 23 | N. | *3 pa 3 Kar.* ***Zarucz. N.P.M.*** |
| 11 | П. | † Хведоза | | 24 | P. | Cimafieja W. M. |
| 12 | У | Тацяны | | 25 | U. | Nawarot św. Pauła |
| 13 | С. | Ярмілы | | 26 | S. | Polikarpa B. M. |
| 14 | Ч. | Ізаі прарока | | 27 | Cz. | Jana Złataw. B. W. D. K. |
| 15 | П. | Паула і Яна | ☾ | 28 | P. | † Waleraho B. W. |
| 16 | С. | Петра Ап. | | 29 | S. | Franciszka Salezaho |
| 17 | Н. | † Антонія Вял. | | 30 | N. | *4 pa 3 Kar.* Martyny P. M. |
| 18 | П. | Апанаса | | 31 | P. | Pietra Nolasko |

Пагода па календару Бруса:

14—вялікі мароз з ветрам. Ад 23 да канца месяца—марозы.

# Люты

ФЕВРАЛЬ 29 дзён

LUTY 29 dzion



| С. с. Праваслаун. і Уніяц. сьв. | | | | N. st. Rymska-Katalickije św. | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 19 | У. | Макара | | 1 | U. | Ihnata B. M. |
| 20 | С. | **Эухвэмы** Вялік. | | 2 | S. | *Hramnicznaj N. P. M.* |
| 21 | Ч. | Максіма | ● | 3 | Cz. | Błażeja Bisk. M |
| 22 | П. | Цімафея | | 4 | P. | † Ansgara i Andreja |
| 23 | С. | Кліма | | 5 | S. | Agaty P. M. |
| 24 | Н. | 4. Аксаны | | 6 | N. | *5 pa 3 Kar.* Daroty P. |
| 25 | Ц. | Грыгора Бог. | | 7 | P. | Romualda op. |
| 26 | У. | Ксэнофонта | | 8 | U. | Jana z Matty |
| 27 | С. | Яна Златавуста | | 9 | S. | Apolonii P. M. |
| 28 | Ч. | Ярэмы | ☽ | 10 | Cz | Scholastyki P. |
| 29 | П. | Ігната | | 11 | P. | † Abj. N. M. P. u Lurd |
| 30 | С. | Трох Сьвяціцялёу | | 12 | S. | Eulalii P. |
| 31 | Н. | Мікіты | | 13 | N. | *6 pa 3 Kar.* Jana |
| 1 | П. | Трыфона | | 14 | P. | Waleraho M. |
| 2 | У | **Стрэценьне М. Б.** | | 15 | U. | Faustyna M. |
| 3 | С. | Сымона, Анны | | 16 | S. | Juljanny P. M. |
| 4 | Ч. | Сідара, Мікалая | | 17 | Cz. | Patrycija B. W. |
| 5 | П. | Агаты | | 18 | P. | † Symona B. M. |
| 6 | С. | Вуколы, Марты | ○ | 19 | S. | Konrada W. |
| 7 | Н. | Тадоры | | 20 | N. | Starazap. Eucharyja B. |
| 8 | П. | Пархвена | | 21 | P. | Maksimijana B. |
| 9 | У. | Нікіпара | | 22 | U. | Kat. św. Pietra |
| 10 | С. | Харлампа | | 23 | S. | Pietra, Damijana B. D. K |
| 11 | Ч. | Уласа. Дмітра | | 24 | Cz. | Siarhieja B. M. |
| 12 | П. | Аляксея | | 25 | P. | † *Macieja Apost.* |
| 13 | С. | Марцініяна | ☾ | 26 | S. | Zygfryda B. W. |
| 14 | Н. | Мясасд. Кірыла | | 27 | N. | Miasapus Aleksandra |
| 15 | П. | Анісіма | | 28 | P. | Leanarda B. W. |
| 16 | У. | Памфілы | | 29 | U. | Ramana op. Makara |

Пагода па календару Бруса:

3—пераменна. Каля 10—сьнег, вецер, мароз. Да 15—сівер і суха.

| С. с. | | Праваслаун. і Уніяц. сьв | N. st. | | Rymska-Katalickije św. |
|---|---|---|---|---|---|
| 17 | С. | Вл. Муч. Тодара | 1 | S | *Albina B W.* |
| 18 | Ч. | Лявона | 2 | Cz. | Aleny Carycy |
| 19 | П. | Архіпа | 3 | P. | † Kunegundy Car. |
| 20 | С. | Гарона | 4 | S. | ***Kazimira Kar. W.*** |
| 21 | Н. | Запусн. Цімафея | 5 | N. | *Zapusnaja.* Adryjana M. |
| 22 | П. | Апанаса | 6 | P. | Wiktora i Wiktoryny M. |
| 23 | У. | Полікарпа | 7 | U. | Tamasza z Akwinu |
| 24 | С. | † Сцяцьце Яна Хрыс. | 8 | S. | † Papielcc. Wincent. Kadł. |
| 25 | Ч. | Тараса | 9 | Cz. | † Franciszki Ryml. |
| 26 | П. | Парфіра | 10 | P. | † 40 Muczenikou |
| 27 | С. | Пракопа | 11 | S. | † Konstancina W. |
| 28 | Н. | 1 посту. Васіля | 12 | N. | *1 postu.* Hryhora Wial. Pap. |
| 29 | П. | Касіяна | 13 | P. | † Krystyny P. M. |
| 1 | У. | Аудоцьці М. | 14 | U. | † Matyldy Kr. Udawy |
| 2 | С. | Хвядота Біск. | 15 | S. | † Klemensa Hofbau |
| 3 | Ч. | Зэнона, Клеоніка | 16 | Cz. | † Abrahama pust. |
| 4 | П. | Гарасіма | 17 | P. | †† Jazepa z Arymat. |
| 5 | С. | Марка | 18 | S. | † Gabryjela Archan. |
| 6 | Н. | Хведара | 19 | N. | *2 postu.* Jazepa Ap. N.P.M. |
| 7 | П. | Васіля | 20 | P. | † Wolframa B. |
| 8 | У. | Домэція, Ермы | 21 | U. | † Benedykta ap. |
| 9 | С. | 40 мучэнікау | 22 | S. | † Kaciaryny W. |
| 10 | Ч. | Кандрата | 23 | Cz. | † Kaciaryny Kar. |
| 11 | П. | Марыі з Эгіпту | 24 | P. | †† Marka i Cimaf. M. |
| 12 | С. | Грыгора Двоеслова | 25 | S. | † ***Zwiastawańnie*** |
| 13 | Н. | Мікіпара, Цярэнція | 26 | N. | *3 postu.* Aleksandra B. |
| 14 | П. | Бэнэдыкта | 27 | P. | † Ruperta B. Jana |
| 15 | У. | Александра | 28 | U. | † Jana Kapistrana |
| 16 | С. | Юльяна | 29 | S. | † Eustazaho |
| 17 | Ч. | Назара | 30 | Cz | † Kwiryna M. |
| 18 | П. | Кірыла | 31 | P. | †† Benjamina M. |

Пагода па календару Бруса:

Ад 1 пачне цяплець і настане пекная і сухая пагода. С 14 да 19—пахмурна і холад. 23—вялікі мароз.

# Красавік

АПРѢЛЬ (30 дзен)
KWIECIEŃ (30 dzion)

# Krasaw

| С. с. Праваслаун. і Уніяц. съв. | | | | N. st. Rymska-Katalickije św. | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 19 | С | Хрызанта | | 1 | S. | †† Teodory M. |
| 20 | Н | Патрыкія | ● | 2 | N. | *4 postu.* Franciszka a Pa |
| 21 | П. | Кіріла | | 3 | P. | † Ryszarda B. W. |
| 22 | У. | Васіля | | 4 | U. | † Izydora B. W. D. K. |
| 23 | С. | Лідзіі | | 5 | S. | † Wincentaho Fer. W. |
| 24 | Ч. | Захара | | 6 | Cz. | † Wilhelma ap. |
| 25 | П. | Благавешчэньне | | 7 | P. | †† Epifania Bisk. |
| 26 | С. | Гаурылы Арх. | | 8 | S. | † Dyonizaho B. W. |
| 27 | Н. | Матроны | | 9 | N. | *5 postu* Maryi i Kleof. |
| 28 | П. | Гиляраго | ☽ | 10 | P. | † Ezechiela Pr. Mar. Eg |
| 29 | У. | Марка | | 11 | U. | † Leona Wialik Pap. |
| 30 | С. | Яна Лісцьвеніка | | 12 | S. | † Julija I Pap. Witolda |
| 31 | Ч. | Іпація | | 13 | Cz. | † Hermenegildy Kar. M. |
| 1 | П. | Марыі | | 14 | P. | †† 7 baleść. N. P. Maryi, Walerjana |
| 2 | С. | Палікарпа | | 15 | S. | † Anastazaho B. M. |
| 3 | Н. | Вербная. Язэпа | | 16 | N. | Wierbnaja. Marceljana. |
| 4 | П. | Плятона | | 17 | P. | † Aniceta P. M. Roberta |
| 5 | У. | Данілы | ○ | 18 | U. | † Bohumiła W |
| 6 | С. | Ягора | | 19 | S. | † Tymona M. |
| 7 | Ч. | Асынкрыта | | 20 | Cz. | Wial. Sulpicija i Serwil |
| 8 | П. | Мар'яны | | 21 | P. | Wial. Anzelma B. W. |
| 9 | С. | Цярэнція | | 22 | S. | Wial. Sotera i Kaja |
| 10 | Н. | **Вялікдзень** | | 23 | N. | ***Wialikdzeń.*** |
| 11 | П. | Анфізы | ☾ | 24 | P. | 2 dz. Wialik. Wojciecha |
| 12 | У. | Арцема | | 25 | U. | Marka Ewanhel. |
| 13 | С. | Арыстарха | | 26 | S. | Kleta i Marcelina P. M. |
| 14 | Ч. | Васілісы | | 27 | Cz. | Teofila i Tertuljany P. |
| 15 | П. | Леоніда | | 28 | P. | † Pauła ad Kryża W. |
| 16 | С. | Сымона | | 29 | S. | Pietra Mucz. |
| 17 | Н. | 2 па Вял. Іоана | | 30 | N. | Prawodna. Kaciaryny |

Пагода па календару Бруса:

2 —вецер. Ад 3—пекная пагода з марозамі да 13. С 14 д
7 —холад з усходнім ветрам. 18—пераменна. 21 і 24—хо-
ладна. 27—вецер. 30—мейсцамі навальніца.

## МАЙ (31 дзень)
## MAJ (31 dzień)



| С. с. | Праваслаўн. і Уніяц. сьв. | | | N. st. | Rymsko-Katalickije św. | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 18 | П. | Юр'я | | 1 | P. | Pilipa i Jakuba Ap. I |
| 19 | У. | Хведара | ● | 2 | U. | Zygmunta Kar. |
| 20 | С. | Януараго | | 3 | S. | *Znachod św. Kryża* |
| 21 | Ч. | Мікіты | | 4 | Cz. | Floryjana Mucz. |
| 22 | П. | Лукаша | | 5 | P. | Piusa V Pap. Anioła |
| 23 | С. | Юр'я | | 6 | S. | Jana u Aleju Ap. |
| 24 | Н. | 3 па Вял. Сабы | | 7 | N. | 1 pa Wial. Damiceli i Eufroz |
| 25 | П. | Марка Эван. | | 8 | P. | Stanisława B. W. |
| 26 | У. | Сьцепана | | 9 | U. | Hryhora Cud. |
| 27 | С. | Сымона | ☽ | 10 | S. | Izydora Arat. |
| 28 | Ч. | Квінціляна | | 11 | Cz | Mamerta B. W. |
| 29 | П. | Арцема | | 12 | P. | Pankraca M. |
| 30 | С. | Якуба апост. | | 13 | S. | Serwaca B. W. |
| 1 | Н. | Ярэмы | | 14 | N. | 2 pa Wial. Bonifaca |
| 2 | П. | Барыса і Глеба | | 15 | P. | Zofii Udawy. Jana |
| 3 | У. | Піотры | | 16 | U. | Jana Nepomycena |
| 4 | С. | Паланеі | ○ | 17 | S. | Paschalisa W. |
| 5 | Ч. | Ірэны | | 18 | Cz. | Feliksa Kapuc. |
| 6 | П. | Іова | | 19 | P. | Piotry, Celestyna |
| 7 | С. | Ніла | | 20 | S. | Bernardyna Sen. |
| 8 | Н. | 5. Яна Багаслова | | 21 | N. | 3 pa Wial. Wiktora |
| 9 | П. | Мікалая Цудатвор. | | 22 | P. | Haleny P. Julii |
| 10 | У. | Ап. Сымона | | 23 | U. | Dezyderaho B. M. |
| 11 | С. | Кірыла і Мэтода | ☾ | 24 | S | Joanny i Afry |
| 12 | Ч. | Панкраца | | 25 | Cz. | Hryhora VII pap. |
| 13 | П. | Александра М. | | 26 | P. | Pilipa Nereusza |
| 14 | С. | Ісідара, Яфрэма | | 27 | S. | Bedy W. D. K. |
| 15 | Н. | 6 па Вял. Андроніка | | 28 | N. | 4 pa Wial. Auhustyna |
| 16 | П. | Хвядота | | 29 | P. | Teodozii |
| 17 | У. | Карнілы | | 30 | U. | Feliksa P. M. |
| 18 | С. | Паланеі | ● | 31 | S. | Anieli i Petroneli |

Пагода па календару Бруса:

1—дождж. 2—мароз. 6—у начы вялікая раса. 13—сыра. 14—у начы мароз. 16—віхор 17—вецер с поудня і пауночы з даждзжом. 28—пераменна. 30 і 31—бурная пагода.

| С. с. Праваслаун. і Уніяц. сьв. | | | N. st. Rymska-Katalickije św. | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 19 | Ч. | Патрыкія | 1 | Cz. | Jakuba Str. B. W. |
| 20 | П. | Аляксея | 2 | P. | Marcelina M. |
| 21 | С. | Канстанц. і Алены | 3 | S. | Erazma B. Mucz. |
| 22 | Н. | 6 па Вял. Васіліска | 4 | N. | 5 pa Wial. Franciszka |
| 23 | П. | Ляонція | 5 | P. | Kryż. dz. Bonifaca |
| 24 | У. | Сымона | 6 | U. | Kryż. dz. Norberta |
| 25 | С. | Грыгора | 7 | S. | Kryż. dz. Roberta op. |
| 26 | Ч. | **Усход Езуса на неба** | 8 | Cz. | ***Uniebaustupleńnie p. Jez*** |
| 27 | П. | Тэрапонта ☽ | 9 | P. | Prima i Felicijana |
| 28 | С. | Мікіты | 10 | S. | Margaryty Kar. |
| 29 | Н. | 7 па Вял. Тэадозіі | 11 | N. | pa Unieb. Barnaby Ap. |
| 30 | П. | Ізаакія, Якуба | 12 | P. | Anufra Pusteln |
| 31 | У. | Ярэмы | 13 | U. | Antoniaho z Padwy |
| 1 | С. | Юстыны | 14 | S. | Bazyla Wialik. |
| 2 | Ч. | Мікіпара ⊕ | 15 | Cz. | Wita i Modesta M. |
| 3 | П. | Кляудзія | 16 | P. | Bennona B. M. |
| 4 | С. | Мітрафана | 17 | S. | Innocentaho M. |
| 5 | Н. | **Сьв. Тройцы.** | 18 | N. | ***Sasłańie Ducha Świat.*** |
| 6 | П. | **Сьв. Духа.** Гіляра | 19 | P. | (2 dz. Siomuchi) Gerw. i Pr |
| 7 | У. | Хвядота | 20 | U. | Sylweryja P. M. |
| 8 | С. | Яхрэма | 21 | S. | Aloiza Gonzagi |
| 9 | Ч. | Кірылы ☾ | 22 | Cz. | Paulina B. W. |
| 10 | П. | Цімафея | 23 | P. | Ahrypiny P. M. |
| 11 | С. | Баутрамея | 24 | S. | † Nar. św. Jana Chr. |
| 12 | Н. | 2 па Тройцы. Анупрэя | 25 | N. | Św. Trojcy, Prospera |
| 13 | П. | Акіліны | 26 | P. | Jana i Pauła M. |
| 14 | У. | Гальяша пр. | 27 | U. | Władysława Kar. W. |
| 15 | С. | Іоны мітр. | 28 | S. | † Leona II Pap. |
| 16 | Ч. | Ціхона | 29 | Cz. | ***Bożaje Cieła*** |
| 17 | Ч. | Мануіла ● | 30 | P. | Emilii i Lucyny |

Пагода па календару Бруса:

1 і 2—бурная пагода. 3 і 4—непагодзь. 10—дождж, пасьля да 14 пераменна. 14—пекная пагода. 19—непагодзь. 21—дождж; пераменная, спакойная пагода для жніва—да канца месяца.

| С. с. | | Праваслаун. і Уніяц. сьв. | N. st. | | Rymska-Katalickije św. |
|---|---|---|---|---|---|
| 17 | С. | Мануйлы | 1 | S. | N. Krywi P. J. Teodoryka |
| 18 | Н. | Чарв. Лявона | 2 | N. | 2 pa z. ś. Nawiedz. N.P.M. |
| 19 | П. | Юды і Зозімы | 3 | P. | Anatolija. |
| 20 | У. | Сыльвэстра | 4 | U. | Jazepa Kalas. |
| 21 | С. | Юльяна | 5 | S. | Antoni Zakkarya |
| 22 | Ч. | Галакціона | 6 | Cz. | Izajasza prar. |
| 23 | П. | Агрыпіны | 7 | P. | *Serca Jezus.* Cyryla i Metod. |
| 24 | С. | Нарадз. Яна Хрыс. ☽ | 8 | S. | Alžbiety Kar. |
| 25 | Н. | кн. Петра | 9 | N. | 3 pa z. ś. Weroniki P. |
| 26 | П. | Давіда | 10 | P. | 7 brat. muczan |
| 27 | У. | Самсона | 11 | U. | Pałagiei P. M. Piusa I. |
| 28 | С. | Кіра | 12 | S. | Jana Gwalberta |
| 29 | Ч. | **Петра і Паула** | 13 | Cz. | Anakleta |
| 30 | П. | Сабор. 12 Апостал. | 14 | P. | Bonawentury |
| 1 | С. | Піотры, Кузьмы і Дзем. ○ | 15 | S. | Henryka Cara |
| 2 | Н. | Нав. Маці Божай | 16 | N. | 4 pa z. ś. ***N. P. M. Szkaplern.*** |
| 3 | П. | Піліпа | 17 | P. | Aleksaho W. |
| 4 | У. | Андрэя | 18 | U. | Symona z Lipn. W. |
| 5 | С. | Сяргея | 19 | S. | Wincent. a Paulo |
| 6 | Ч. | Марты | 20 | Cz. | Czesława |
| 7 | П. | Тамаша | 21 | P. | Praksedy |
| 8 | С. | Анатоля ☾ | 22 | S. | Maryi Magdaleny |
| 9 | Н. | Панкрата | 23 | N. | 5 pa z. ś. Apolinara |
| 10 | П. | Антонія | 24 | P. | Kynegundy Kar. |
| 11 | У. | Ольгі | 25 | U. | Jakuba ap. |
| 12 | С. | Прокла | 26 | S. | Anny Matki N. P. M. |
| 13 | Ч. | Арх. Гаурылы | 27 | Cz. | Natalii M. |
| 14 | П. | Акілы, Сьцепана | 28 | P. | Inocentaho P. |
| 15 | С. | Валадзімера | 29 | S. | Marty P. Olawa |
| 16 | Н. | Ахвеногена ● | 30 | N. | 6 pa z. ś. Julity |
| 17 | П. | Марыны | 31 | P. | Ihnata Lojoli |

Пагода па календару Бруса:

У пачатку месяца—пераменная, спакойная пагода. 14—дождж. 21—пекная пагода. 29—пераменна.

# Жнівень — АВГУСТ 31 дзень / SIERPIEŃ 31 dzień — Žniwie[ń]

| Праваслаун. і Уніяц. сьв. | | | | N. st. Rymska-Katalickije św. | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 18 | У. | Макрыны | | 1 | U. | Piotry u akowach |
| 19 | С. | Амельяна | | 2 | S. | ***N. P. M. Anielskaj*** |
| 20 | Ч. | **Галіяша прар.** | | 3 | Cz. | Zn. ast. św. Ściepana |
| 21 | П. | Сымона, Анупрэя | | 4 | P. | Daminika W. |
| 22 | С. | Марыі Магдалены | | 5 | S. | N. P. M. Śnieżnaj |
| 23 | Н. | Аполінара ☽ | | 6 | N. | 8 p. z. ś. Pramien. P. Jez. |
| 24 | П. | Барыса і Глеба | | 7 | P. | Kajetana W. Donata |
| 25 | У. | Анны | | 8 | U. | Cyryjaka, Larga |
| 26 | С. | Ермолая | | 9 | S. | Ramana M. |
| 27 | Ч. | Панцелеймона | | 10 | Cz | Waurzynca M. |
| 28 | П. | Прахора | | 11 | P. | Zuzanny i Dygny P. |
| 29 | С. | Сілы | | 12 | S. | Klary P., Hilaryi M. |
| 30 | Н. | Эудакіма ○ | | 13 | N. | 8 p. z. ś. Hipolita i Kasjana |
| 31 | П. | Сілуана | | 14 | P. | † Post. Euzebija K. |
| 1 | У. | Махабэяу братоу | | 15 | U. | ***Uniebauziaćcie N. P. M.*** |
| 2 | С. | Сьцепана | | 16 | S. | Joachima, ajca N. P. M. |
| 3 | Ч. | Фаустына | | 17 | Cz. | Jacka Wyzn. Mirona |
| 4 | П. | Антоніна | | 18 | P. | Firmina B. W. |
| 5 | С. | Эусігнія | | 19 | S. | Marjana i Rufina |
| 6 | Н. | Прам. П. Езуса ☾ | | 20 | N. | 9 p. z. ś. Bernarda op. |
| 7 | П. | Дамацея | | 21 | P. | Joanny Frem. Ud. |
| 8 | У. | Мірона | | 22 | U. | Symforjana i Tymof. |
| 9 | С. | Аг. Мацея | | 23 | S. | Pilipa i Benicija W. |
| 10 | Ч. | Ляура | | 24 | Cz. | Bautramieja ap. |
| 11 | П. | Кляудыя | | 25 | P. | Ludwika Kar. |
| 12 | С. | Анікіты | | 26 | S. | Ireneusza |
| 13 | Н. | Ціхона | | 27 | N. | 10 p. z. ś. Pieranoscieła św. Ka |
| 14 | П. | † Аркадія ● | | 28 | P. | Auhnstyna B. W. D. K. |
| 15 | У. | **Усьпеньне М. Божай** | | 29 | U. | Sc. Haławy św. Jana Ch |
| 16 | С. | Юльяна | | 30 | S. | Rożу Liman., Feliksa |
| 17 | Ч. | Стратона | | 31 | P. | Rajmunda W. Paulina. |

Пагода па календару Бруса:

2—ціш. 3—вецер. 5—дождж, пасьля пекная пагода да 13. 14—гарачыня. 20—холад. 22—холад і бура. 27—пекная пагода.

# Верасень — СЕНТЯБРЬ 30 дзён / WRZESIEŃ 30 dzion — Wierasień

| С. с. | | Праваслаун. і Уніяц. сьв | | N. st. | | Rymska-Katalickije św. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 18 | П. | Хлора | | 1 | P. | Idzaho apata |
| 19 | С. | Андрэя | | 2 | S. | Sciepana Kar. Wenhr. |
| 20 | Н. | Самойлы | | 3 | N. | 11 p. z. ś. Branisławy P. |
| 21 | П. | Тадэуша | | 4 | P. | Rozalii P. |
| 22 | У. | Маісея | ☽ | 5 | U. | Waurzynca i Wikt. |
| 23 | С. | Урывэя | | 6 | S. | Zachara Prar. |
| 24 | Ч. | Эуціхія | | 7 | Cz. | † Wigil. Reginy, Jana |
| 25 | П. | Баутрамея | | 8 | P. | ***Naradz. N. P. Maryi*** |
| 26 | С. | Андрыяна | | 9 | S. | Sergija Pap. W. |
| 27 | Н. | Пімена | | 10 | N. | 12 p. z. ś. Mikałaja z Tol. |
| 28 | П. | Маісея | ○ | 11 | P. | Prota i Jacka |
| 29 | У. | **Сц. Яна Хрысьц.** | | 12 | U. | Gwidona W. |
| 30 | С. | Хрыстафора | | 13 | S. | Eugienii P. |
| 31 | Ч. | **Пал. пояса М. Божай** | | 14 | Cz. | Padwyż. św. Kryża |
| 1 | П. | Сымона | | 15 | P. | Nikodema kapł. |
| 2 | С. | Маманта | | 16 | S. | Euzebii P. |
| 3 | Н. | Тэокціста | | 17 | N. | 13 p. z. ś. Blizn. św. Franc. |
| 4 | П. | Вавілы | ☾ | 18 | P. | Jazepa, Ireny |
| 5 | У. | Захара і Альжб. | | 19 | U. | Januaraho |
| 6 | С. | Міхала | | 20 | S. | Eustachaho |
| 7 | Ч. | † Іоана і Лукаша | | 21 | Cz. | Mateusza ap. |
| 8 | П. | **Нарадж. М. Божай** | | 22 | P. | Tamasza B. W. |
| 9 | С. | Яхіма і Анны | | 23 | S. | Tekli P. M. |
| 10 | Н. | Мінодоры | | 24 | N. | 14 p. z. ś. Gerarda B. M. |
| 11 | П. | Тэадоры | | 25 | P. | Firmina |
| 12 | У. | Аутанома | | 26 | U. | Cypryjana i Justyna |
| 13 | С. | Лявона | ● | 27 | S. | Ładysława z Gieln. |
| 14 | Ч. | **Падн. Крыжа** | | 28 | Cz. | Wacława Kar. |
| 15 | П. | Мікіты | | 29 | P. | ***Michała Archanioła*** |
| 16 | С. | Людмілы | | 30 | S. | Hieronima |

Пагода па календару Бруса:

1—у начы вецер і бура. 2 і 8—суліць буру; можна у першай палові месяца чакаць ветру і навальніцы. 14—вецер з заходу і пахмурна. 24—пераменна. 25 і 26 сільны вецер. 28 і 29—холадна і вецер.

# Кастрычнік  ОКТЯБРЬ (31 дзень) / PAZDZIERNIK (31 dzień)  Kastrycznik

| С. с. Праваслаун. і Уніяц. сьв. | | | | N. st. Rymska-Katalickije św. | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 17 | Н. | Зофіі, Веры, Надз. Люб. | | 1 | N. | 15 p. z. ś. Rożancowaj M. B. |
| 18 | П. | Эумонія | | 2 | P. | Aniołau Starażou |
| 19 | У. | Дарымэдонта | | 3 | U. | Kandyda i Ewalda |
| 20 | С. | Міхала | ☽ | 4 | S. | Franciszka Ser. W. |
| 21 | Ч. | Змітра | | 5 | Cz. | Placyda M. |
| 22 | П. | Тамаша | | 6 | P. | Brunona |
| 23 | С. | Андрэя | | 7 | S. | Marka Pap. |
| 24 | Н. | Мікандры | | 8 | N. | 16 p. z. ś. Pelagii i Bryg. |
| 25 | П. | Сэргія | | 9 | P. | Dyoniza B. M. |
| 26 | У. | Яна Апостала | | 10 | U. | Franciszka Borg. |
| 27 | С. | Сабація | ◐ | 11 | S. | Placydy i Zenejdy |
| 28 | Ч. | Харытона | | 12 | Cz. | Maksymiljana B. |
| 29 | П. | Кір'яна | | 13 | P. | Edwarda Kar. |
| 30 | С. | Грыгора | | 14 | S. | Kaliksta Pap. M. |
| 1 | Н. | *Пакровы* Б. М. | | 15 | N. | 17 p. z. ś. Jadwigi i Tares. |
| 2 | П. | Цыпрыяна | | 16 | P. | Martyniana |
| 3 | У. | Дыоніза | | 17 | U. | Wiktora M. |
| 4 | С. | Ерахвея | | 18 | S. | Łukasza Ewan. |
| 5 | Ч. | Піотры, Аляксея | ☾ | 19 | Cz. | Piotry z Alkantary |
| 6 | П. | Ап. Тамаша | | 20 | P. | Jana Kantaho |
| 7 | С. | Сэргія М. | | 21 | S. | Urszuli P. M. |
| 8 | Н. | Палагеі | | 22 | N. | 18 p. z. ś. Korduli P. M. |
| 9 | П. | Ап. Якуба | | 23 | P. | Seweryna B. |
| 10 | У. | Эулямпія | | 24 | U. | Rafała Arch. |
| 11 | С. | Зынаіды | | 25 | S | Kryspina i Krysp. |
| 12 | Ч. | Андронікі | ● | 26 | Cz. | Ewarysta P. M. |
| 13 | П. | Хлорэнта | | 27 | P. | Sabiny P. M. |
| 14 | С. | Параскевы | | 28 | S. | Szymona i Tadeusza ap. |
| 15 | Н. | Лук'яна | | 29 | N. | 19 p. z. ś. Narcyza |
| 16 | П. | Лёнгіна | | 30 | P. | Hermana B. |
| 17 | У. | Анхвіма | | 31 | U. | † Post. Symfroniusza |

Пагода па календару Бруса:

3—пераменна. Да 13—ясная пагода. 15 і 16—пераменна. 17—дождж, холадна. 18—непагодзь. 22—дажджліва. 24 і 29—пекная пагода.

## істапад — НОЯБРЬ 30 дзён / LISTOPAD 30 dzion — Listapad

| С. Праваслаун. і Уніяц. сьв. | | N. st. Rymska-Katalickije św. | | |
|---|---|---|---|---|
| С. | **Лукаша Ап.** | 1 | S. | ***Usich Swiatych*** |
| Ч. | Клеопатры | 2 | Cz. | ***Zaduszny dzien*** |
| П. | Арпема | 3 | P. | Sylwii, Huberta |
| С. | Уршулі | 4 | S. | Karala Borom. |
| Н. | Ірэны | 5 | N. | 20 p. z. ś. Zachar. i Alżb. |
| П. | Ап. Якуба | 6. | P. | Leonarda W. |
| У. | Арэхвы | 7 | U. | Nikandra M. |
| С. | Марціяны | 8 | S. | Gotfr. i Maura W. |
| Ч. | Зьмітра | 9 | Cz. | Teodora i Oresta |
| П. | Капітоліны | 10 | P. | Andreja z Awelinu W. |
| С. | Цярэнта | 11 | S. | Marcina B. W. |
| Н. | Анастазіі | 12 | N. | 21 p. z. ś. Marcina P. M. |
| П. | Зэнобія | 13 | P. | Stanisława Kostki |
| У. | Нікодэма | 14 | U. | Jukunda B. W. |
| С. | Кузьмы і Дземяна | 15 | S. | Gertrudy, Leopolda |
| Ч. | Вавілы | 16 | Cz. | Edmunda |
| П. | Язэпа | 17 | P. | Hryhora Cud. B. W. |
| С. | Нікандра | 18 | S. | Odona P. |
| Н. | Сьцепана | 19 | N. | 22 p. z. ś. Alżbiety Kar. |
| П. | Варлама | 20 | P. | Feliksa Wal. W. |
| У. | Нікандра | 21 | U. | ***Achw. N. P. Maryi*** |
| С. | Арх. Міхала | 22 | S. | Cecylii P. M. Marka |
| Ч. | Анісіпора | 23 | Cz. | Klemensa P. M. |
| П. | Родзіона | 24 | P. | Jana ad Kryża |
| С. | Іоанна | 25 | S. | Kacieryny P. M. |
| Н. | **Яна Златав.** | 26 | N. | Aposzn. p. z. ś, Piotry P. M. |
| П. | Ап. Піліпа | 27 | P. | Wirgilija B. W. |
| У. | Гурыя | 28 | U. | Mansweta B. M. |
| С. | Кацярыны | 29 | S. | Saturnina B. |
| Ч. | Ап. Мацея | 30 | Cz. | ***Andreja Ap.***, Justyny |

Пагода па календару Бруса:

1—непагодзь. 2—пахмурна, суліць дождж. 8 і 9—дождж і сьнег. 14 і 16—дождж. 18—сьцюжа. 25—дождж і сьнег. 27—пахмурна. 29—вецер.

| С. с. Праваслаун. і Уніяц. сьв | | | | N. st. Rymska-Katalickije św | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 17 | П. | Грыгора Цуд. | | 1 | P. | Eligija B. W. |
| 18 | С. | Платона | ☽ | 2 | S | Bibijanny P. M. |
| 19 | Н. | Варлама | | 3 | N. | 1 Adw. Franciszka K |
| 20 | П. | Грыгора | | 4 | P. | Barbary P. M. |
| 21 | У. | Ахвярав. М. Божай | | 5 | U. | Sabby ap. Niceta |
| 22 | С. | Пілемона | | 6 | S. | † Mikałaja B. W. |
| 23 | Ч. | **Александра** | | 7 | Cz. | Wigil. Ambrożaho |
| 24 | П. | Кацярыны | | 8 | P. | *Niepak. pacz. N. P. M* |
| 25 | С. | Петра | ○ | 9 | S. | Waleryi i Leokadii |
| 26 | Н. | Юр'я | | 10 | N. | 2 Adw. *N. M. P. Lor* |
| 27 | П. | Рамана | | 11 | P. | Damaza P. W. |
| 28 | У. | Сьцепана | | 12 | U. | Aleksandra M. |
| 29 | С. | Парамона | | 13 | S. | † Łucyi P. M. |
| 30 | Ч. | **Ап. Андрэя** | | 14 | Cz | Dyoskora |
| 1 | П. | Наума | | 15 | P. | † Walerjana M. |
| 2 | С. | Абакума | | 16 | S. | Euzebja B |
| 3 | Н. | Зафоніі | ☾ | 17 | N. | 3 Adw. Łazara B. |
| 4 | П. | Барбары | | 18 | P. | Gracijana |
| 5 | У. | Саббы, Захары | | 19 | U. | Daryja |
| 6 | С. | Мікалая Біск. | | 20 | S. | † Such. Zenona B. |
| 7 | Ч. | Амбражэя | | 21 | Cz. | Tamasza |
| 8 | П. | Патапа | | 22 | P. | † Such. Herona |
| 9 | С. | Анны | | 23 | S. | † Wigil. Such. Wiktor |
| 10 | Н. | Сьцепаніі | ● | 24 | N. | 4 Adw. Adama i Ewy |
| 11 | П. | Даніла | | 25 | P. | *Naradż. P. Jez. Chr.* |
| 12 | У. | Спірыдона | | 26 | U. | *Sciepana Mucz.* |
| 13 | С. | Эустафія | | 27 | S. | Jana Ewan. |
| 14 | Ч. | Хвірса | | 28 | Cz. | Mładziankou |
| 15 | П. | Сьцепана | | 29 | P. | Tamasza B. |
| 16 | С. | Агея | | 30 | S. | Wigil. Eugenija B. |
| 17 | Н. | Данілы | ☽ | 31 | N. | Sylwestra P W. |

Пагода па календару Бруса:
9—переменна. 14—суліць сьнег. 15—пекная пагода. 17—дождж. 21—мароз. 23—адліга. 28—вецер. 30—пахмурна слоць. 31—пахмурна.

# Усход і заход сонца:

| МЕСЯЦ: | Чысло: | Усход: г. | Усход: м. | Заход: г. | Заход: м. | Даужыня дня: г. | Даужыня дня: м. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| нежэнь . . . . . | 1 | 8 | 17 | 4 | 1 | 7 | 42 |
| „ . . . . . | 15 | 7 | 58 | 4 | 28 | 8 | 30 |
| ты . . . . . | 1 | 7 | 27 | 5 | 2 | 9 | 35 |
| „ . . . . . | 15 | 6 | 55 | 5 | 31 | 10 | 36 |
| рэц . . . . . | 1 | 6 | 21 | 5 | 59 | 11 | 38 |
| „ . . . . . | 15 | 5 | 45 | 6 | 27 | 12 | 42 |
| асавік . . . . . | 1 | 5 | 3 | 6 | 59 | 13 | 56 |
| „ . . . . . | 15 | 4 | 31 | 7 | 25 | 14 | 54 |
| й . . . . . | 1 | 3 | 57 | 7 | 55 | 15 | 58 |
| „ . . . . . | 15 | 3 | 35 | 8 | 19 | 16 | 44 |
| рвень. . . . . | 1 | 3 | 23 | 8 | 37 | 17 | 14 |
| „ . . . . . | 15 | 3 | 24 | 8 | 40 | 17 | 16 |
| пень . . . . . | 1 | 3 | 40 | 8 | 30 | 16 | 50 |
| „ . . . . . | 15 | 4 | — | 8 | 11 | 16 | 11 |
| нівень . . . . . | 1 | 4 | 30 | 7 | 38 | 15 | 8 |
| „ . . . . . | 15 | 4 | 57 | 7 | 5 | 14 | 8 |
| расень . . . . . | 1 | 5 | 28 | 6 | 23 | 12 | 55 |
| „ . . . . . | 15 | 5 | 54 | 5 | 47 | 11 | 53 |
| стрычнік . . . . . | 1 | 6 | 24 | 5 | 8 | 10 | 44 |
| „ . . . . . | 15 | 6 | 58 | 4 | 34 | 9 | 41 |
| тапад . . . . . | 1 | 7 | 27 | 4 | 2 | 8 | 35 |
| „ . . . . . | 15 | 7 | 53 | 3 | 42 | 7 | 49 |
| дзень . . . . . | 1 | 8 | 15 | 3 | 33 | 7 | 18 |
| „ . . . . . | 15 | 8 | 24 | 3 | 39 | 7 | 15 |

# Спісак беларускіх грамадзкіх інстытуцый у Вільні:

1. **Беларускі Камітэт помачы пацярпеушым ад вайны:** В[illegible]ленская вул. 33, 1.

2. **Школьная Камісія** пры Беларускім Камітэці пома[illegible] пацярпеушым ад вайны. Адрэс: Віленская 33, 1.

Камісія аткрыла пачатковые беларускіе школы: 1) А[illegible]токоль 23; 2) Артылерыйская 1; 3) Георгіеускі пр. 44, 1[illegible] 4) Замковы завул. 16 (на Зарэччы).

Ладзяцца новые школы у іншых часьцях места Віль[illegible]

3. Для падгатоукі народных вучыцялёу да беларуск[illegible] школ аткрыты **Вячорные Курсы:** — Георгіеускі пр. 44, 18.

4) **Беларускі Музыкальна-Драматычны Кружок** — Портов[illegible] вул 6-а.

5. **Беларускае Выдавецкае Таварыство**—Віленская 33, 1.

6. **Беларуская Кнігарня** — Завальная 7. Усе беларуск[illegible] кніжкі. Кніжкі для школы.

7. **„Наша Ніва“** — беларуская тыднёвая газэта. Віле[illegible]ская вул. 29.

8. **Бібліотэка „Знаньне“**—Віленская вул. 33. Аддзел бе[illegible]ларускіх кніг.

9. **„Райніца“** — Беларускае Сцажывецкае Таварыств[illegible] Членская складка—10 руб., уступная плата—50 кап.

Пры Таварыстве—местовая крама для прадажы сп[illegible]жыуных прадуктау. Адрэс: В. Погулянка 17.

# Курган.

*Памяці С. Полуяна.*

I.

Паміж пустак, балот беларускай зямлі,
На ўзбярэжжы рэкі шумнацечнай
Дрэмле памятка дзён, што ў нябыт уцяклі,
Ўдзірвянелы курган векавечны.

Дуб гальлё распусьціў карэнасты над ім;
Сухазельле у грудзі ўпілося;
Вецер стогне над ім уздыханьнем глухім,—
Аб мінуўшчыне ў жальбах галосе.

На Купальле там птушка садзіцца, пяе;
У Піліпаўку воўк нема вые;
Сонцэ днём распускае там косы свае,
Ночкай зоры глядзяць залатые.

Хмары неба ўсьцілалі мо тысячу раз;
Пяруны білі с края да края;
Ён стаіць—гэта памяць людзкая—паказ...
Толькі гутарка ходзе такая:

II.

На гарэ на крутой, на абвітай рэкой
Лет назад таму сотня, ці болей,

Белы хорам стаяў, недаступнай сьцяной
Грозна думна глядзеў на прывольле.

У нагах у яго разсьцілаўся абшар
Хвоек гонкіх і пахані чорнай,
Сонных вёсак шары, хат амшалых, як мар,
Хат з сямьёй душ падданых, пакорных.

Князь у хорамі жыў слаўны сьвету ўсяму,
Недаступны і грозны, як хорам;
Хто хацеў, не хацеў—біў паклоны яму;
Спуску, ласкі ня знаў непакорам.

Зневажаў, катаваў ён з дружынай сваей;
Стражы князевы ў полі і дома;
Толькі модлы расьлі небу ў сэрцах людзей,
І пракляцьце расло пакрыёма.

III.

Раз бяседа вялікая ў князя была:
На пасад дачку-княжну садзілі;
За сталом він заморскіх крыніца цякла;
Бегла музыка ўкруг на паўмілі.

На вясельле-разгул наплыло, як на сход,
Госьці знатных з усюль, за паўсьвета;
Гэткай гучнай бяседы ня помніў народ,
Гэткіх скарбаў, брылянтаў, саетаў.

Дзень—другі ўжо грымела у князя гульня,
І музыкі і чаркі зьвінелі;
Выдумлялі забаў новых кожнаго дня;
Што хацелі, ўсяго госьці мелі.

Ажно трэцьцяго дня князь прыдумаў адну
Для дружыны пацеху—забаву:

Загадаў ён пазваць гусьляра—старыну,
Гусьляра з яго ведамай славай.

IV.

Акалічны народ гусьлі знаў гусьляра;
Песьня-дума за сэрцэ хватала;
Ўвакруг гэтай душы дудара—званара
Казак дзіўных зляжылась німала.

Кажуць, толькі як выйдзе і ўдарэ як ён
Па струнах з неадступнаю песьняй,
Сон злетае с павек, болю цішыцца стон,
Не шумяць ясакоры, чарэсьні;

Пушча-лес не шуміць, белка, лось не бяжыць,
Салавей-птушка ў той час сціхае;
Паміж вольхаў рэка, як што дзень, не бурліць,
Паплаўкі рыба-плотка хватае.

Прытаіцца да моху русалка, лясун;
Каня вечнаго „піць“ не заводзе,
Пад звон-песьню жывучых гусьляравых струн
Для ўсіх папараць-кветка ўзыходзе.

V.

Прывела гусьляра з яго ніўных сяліб
Дворня князева ў хорам багаты,—
Пасадзілі на ганку, між клёнаў і ліп,
На цэгляным парозі магната.

Невыдумная сьвітка -убор на плечах,
Барада, як сьнег белы—такая,
Незвычайны агонь у задумных вачах,
На каленях лягли гусьлі-баі.

Водзе пальцэм худым па сталёвых струнах,
К песьні—музыцэ ладзіцца, строе;
Вотклік бьецца ад струн па сьцюдзёных сьце-
нах,
Заміраючы ў сковах пакояў.

Вось настроіў, навёў тон у струнах, як сьлед,
Не зірнуўшы на гулі ні разу,
І сядзіць гэты сумны, як лунь, белы дзед
І чэкае ад князя прыказу.

VI.

„Што-ж маўчыш ты, гусьляр, ніў, лясоў песь-
не-бай,
„Славай хат маіх подданых слаўны!?
„Нам сягоньня зайграй, нам сваіх песень дай.
„Князь умее плаціць незвычайна!

„Запяеш па-душы, дасі ўцехі гасьцям —
„Поўны гусьлі насыплю дукатоў;
„Не пад-мысль песьня будзе каму нібудзь нам,
„Канаплянуе возьмеш заплату.

„Знаеш славу маю, знаеш сілу маю...
„Многа знаю і чуў аб табе я,—
„І я сам, як і ты, так табе запяю...
„Ну, пара пачынаць, дабрадзею!“

Гэтак слухае, выслухаў князя гусьляр;
Заіскрыліся вочы сівые;
Патануў у скляпеньнях адзін, другі ўдар,
І заплакалі струны жывые:

VII.

„Гэй, ты, князь! гэй, праслаўны на цэлы бел-
сьвет!

„Не такую задумаў ты думу,—
„Не дае гусьлярам сказу золата цьвет,
„Белых хорамоў пьяные шумы.

„Скурганіў-бы душу чырванцом тваім я,
„Гусьлям, княжэ, ня пішуць законаў;
„Небу справу здае сэрцэ—думка мая,
„Сонцу, зорам, арлам толькі роўна.

„Відзіш, княжэ, загоны, лясы, сенажаць,—
„Ім пакорны я толькі з гусьлямі.
„Сілен, княжэ, караць, галаву сілен зняць,—
„Не скуеш толькі дум ланцугамі.

„Славен, грозен і ты, і твой хорам-астрог—
„Бье ад сьцен, цэгел лёдам зімовым,—
„Сэрцэ маеш, як гэты цэгляны парог,
„І душу, як скляпоў гэтых сховы.

VIII.

„Глянь ты, слаўны ўладар, на палеткі свае:
„Сарачні там сох бачыш, як блудзе,
„А ці чуў ты, аб чым там араты пяе?
„Дзе і як жывуць гэтые людзі?

„Глянь у лёхі свае, ў падзямельлі глянь, князь,
„Што настроіў пад хорамам гэтым:
„Брацьця корчацца там, табой кінуты ў гразь,
„Чэрві точуць жывых іх, раздзетых.

„Ты ўсё золатам хочэш прыцьміць, загаціць...
„Ці-ж прыгледзіўся, хорамны княжэ?
„Кроў на золаці гэтым людзкая блішчыць,
„Кроў, якой і твая моц ня змажэ.

„Ты брылянтамі ўсыпаў атласы і шоўк—
„Гэта цёртая сталь ад кайданаў,
„Гэта вісяльні петляў развіты шнурок,
„Гэта, княжэ, твае саматканы.

IX.

„Стол ты ўставіў ядой, косьці шмат пад сталом,—
„Гэта косьці бядноты рабочай.
„Пацешаешся белым, чырвоным віном,—
„Гэта сьлёзы нядолі сірочай.

„Хорам выстраіў ты, твайму воку так міл,
„Адшліфована цэгла і камень,—
„Гэта памяткі—пліты з неўчасных магіл,
„Гэта сэрц скамянеўшыхся пламень.

„Люба чуці табе скочны музыкі звон:
„Ты, дружына пьеце асалоду,—
„А ці ўслухаўся ты, як плыве з яе стогн,
„Стогн пракляцьця табе, твайму роду?!

„Ты зьбялеў, ты дрыжыш, слаўны княжэ, ўладар!
„Госьці хмурны, а дворня знямела...
„Ну, што, княжэ? пара даць за песьню мне дар!
„Выбачай, калі спеў мо́ няўмела“.

X.

Князь стаіць, князь маўчыць; жуда, помста бье з воч;
Гулі зглухлі: ні жартаў ні сьмехаў...
Думаў князь, выдумляў, дрогнуў шабляй наўзбоч.
Толькі з лоскатам выбегло рэха.

„Гэй, ты, сонцу раўня, не на тое пазваў
„На вясельле цябе сваей княжны!..
„Ты—шалёны старык! хто цябе дзе хаваў?
„Ты, знаць, выродак цемры сермяжнай.

„Ты адважыўся мне на сьляпы перакор
Вызваняці сусьветные трэлі;
Платы маю шмат я для такіх непакор,
„Хто сябе проці мне стаць асьмеліў.

„Я па князеўску ўсім і плачу, і люблю;
„Ты ня хочэш дукатаў,—ня трэба!...
„Ўзяці старца і гусьлі жыўцом у зямлю!
„Знае хай, хто тут пан: я, ці небо!"

XI.

Падхапілі, ўзялі гусьляра-старыка,
Гусьлі разам яго сама-гуды;
Па-над берэг круты, дзе шумела рэка,
Павялі, панясьлі на загубу.

Мейсцэ выбралі здатнае, вырылі дол,
Дол тры сажні шырокі, глыбокі,
Закапалі, убілі асінавы кол,
Далі насып тры сажні высокі.

Не чэсалі дамоўкі яму сталяры,
Не заплакалі бліжніе вочы;
Змоўклі гусьлі і ён с тэй пары—да пары;
Сум і ціша залеглі, як ночай.

Толькі князеўскі хорам гудзеў, не маўчаў;
Шалы, музыка ў тахт рагаталі;
Не адну віна бочку князь кончыў, пачаў;
Шлюб-вясельле ўсё княжны гулялі.

XII.

Пацяклі, паплылі за гадамі гады...
  На гусьляравым насьпе жвіровым
Палыны узышлі, вырас дуб малады,
  Зашумеў непанятлівым словам.

Лет за сотню звёў час, ці і болей мо́ лет;
  Зацьвілі перэказы ў народзе;
Кажуць людзі: ў год раз ночкай з гусьлямі дзед
  С кургана, як сьнег белы, выходзе.

Гусьлі строе свае, струны звонка зьвіняць,
  Жменяй водзе па іх абамлелай,
І ўсё нешта пяе, што жывым не паняць,
  І на месяц глядзіць, як сам, белы.

Кажуць, каб хто калі зразумеў голас той,
  Не зазнаў бы ніколі ўжо гора...
Можна тут веру даць—толькі слухаць душой...
  Курганы шмат чаго нам гавораць.

**Янка Купала.**

23/V—1910 г.

## Зло не заусёды—зло.

Цэлае лета вісеў жолуд на старым дубе. Бог ведае, як далей, а пакуль ён быў малы, вялікаго гора зазнаць яму не прышлося. Праўда, на яго тады ніхто не зварачаў і увагі: як бы яго і на сьвеці не было. Толькі сонейко, выплыўшы з-за лесу, узіралося на яго і пеставало сваім цяплом, бы тая маці. А калі, бывало, яно прыпекало надта горача—любоў часта пераходзіць свае граніцы,—маленькі жалудок хаваўся у цяньку густых лістоў, як пан пад парасонам, і яму заўсёды было добра.

Так і вісеў ён, ні для кога незаметны.

Але-ж ў рэшці вісець яму абрыдла.

Яно такі і праўда: як бы там ні было добра, але калі гэтае дабро цэлы век астаецца без усякай змены, то яно лёгка перэстае быць дабром. Гэтак было і з жолудам: захацелося яму другога жыцьця; так і цягнула яго саскачыць з галіны і пакачацца па мяккой зямлі. Не раз ён ужо парываўся зрабіць гэта. Сказаўшы праўду, трохі з ветру гарыць сьвет. Бывала, чуць што ўзыйдзе сонцэ, гэты жартаўнік і штукар-вецер зараз і падкрадзецца, але так, каб ня чуў стары дуб, і пачне баламуціць дубовых сынкоў. Што казаў жолуд, ня ведаю. Болей сьмелы вецер гаварыў грамчэй, і вось што ён шэптаў раз жолуду.

— Дурны ты! я пражыў на сьвеці болей

вякоў, як лістоў на гэтым дубе, і кажу табе: раз у цябе ёсць сіла, ты заўсёды знойдзеш спосаб жыць на сьвеці і ты праб'еш сабе дарогу—што жывое, жывым і застанецца.—

А стары дуб тым часам гаварыў так: Сынок! патрывай ешчэ трошкі, падрасьці ўздужай. О! ты ешчэ ня ведаеш, як цяжка жыць на сьвеці. Паслухай мяне старога. — Ведама бацька: шкада яму сына.

— Не пускае бацька,—ціханька шэптаў жолуд на намову ветра.

І трэба-ж было, каб гэту гутарку прачула сьвіньня! Раз, ужо зусім пад восень, жолуд убачыў, як пад дуб, рохкаючы, трушком падбегала лапавухая асоба. Угледзеўшыся добра, жолуд абамлеў: на зямлі лежала шмат такіх-жэ, як і ён, жалудоў, і сьвіньня хрумстала іх без усякай жаласьці. На тое ж яна і сьвіньня, даруй, Божэ, грэх. З вялікаго страху бедны жолуд задрыжаў, вылузаўся з місачкі і упаў на зямлю у двух кроках ад сьвіньні! Але упаў ён як раз у тую яміну, што вырыла сьвіньня сваім ўласным доўгім лычом.

І вось што вышла: сьвіньня хацела паесьці жалуды—і памагла вырасьці аднаму жолуду, вырыўшы яму пасьцельку. Жолуд на другі год прарос і стаў дубком, а сьвіньню людзі закалолі, і яна стала мясам.

**Тарас Гушча.**

# Таклюся-сухотніца.

(*Беларускіе тыпы*).

I.

Аж жаль бярэ, як узглянеш на Таклюсю: худая,—адны косьці, твар асунуўся, пазелянеў, вочы заваліліся глыбока пад лоб, грудзі высахлі, рукі цялёпаюцца, як шчэпкі,—хоць у труну кладзі.

— Сухотніца! кажуць людзі, з жалем глядзячы на Таклюсю: і у чым толькі яе душа дзяржыцца?

Запаўшые у падлобьбе глыбока вочы, смутны, задумчывы твар, зморшчэны лоб і моцна сціснутые вусны,—усё гэта яўна давадзіць, што у сваей душцы Таклюся носіць некую вельмі дакучную думу, ад каторае яна ніяк ня можэ адвязацца і каторая кіруе ею, куды захочэ. Ад гэтай дакучнай думкі, што як пьяўка смокчэ яе сэрцэ, яна мусі і высахла.

Якая гэта думка апанавала Таклюсіным сэрцэм і ссушыла яе самую,—аб гэтым мы даведаемся потым, пачэкаўшы крыху, а цяпер паглядзімо, як жыве наша сухотніца.

Хоць наўзгляд Таклюся паказваецца шчуплаю і благою, але на усём сяле лічыцца першай работніцай, вельмі здатнай да усякай гаспадарскай справы.

Кожын дзень яна ўстае ешчэ дзе да пеўнёў і с пацерамі прыймаецца за работу· гато-

віць страву для сваей сямьі, прадзе кудзелю, або шые дзецям сарочачкі ды нагавічкі. Ўецца ў сваей цёмнай хатцы, як пчолка у вулейку; і за што ня возьмецца, работа у яе проста кіпіць і спорыцца.

Нудна гудзе у Таклюсіных руках пузатае верэцяно, трашчыць у печы, разгараючыся, удушлівы ядловец, храпуць на запеку пад старым радном заснуўшые хлопцы, а над гэтымі галасамі, як звон над кірмашным гоманам, нясуцца поўные жалю, поўные надзеі і цёплаго чуцьця словы Таклюсіных пацероў: „Езу добры, Божэ міласьцівы! змілуйся над намі, людзьмі нямочнымі, адпусьці нам нашы цяжкіе грахі і адкрый нам Сваю сьвятую волю“..

Зімой Таклюся дагледзіць як найлепей сваю худобу—кароўку і волікоў, накорміць у пору авечэк, заклічэ ў хату азябшых парасятак і абагрэе іх пад запекам, а затым не забудзе і сваіх хлопчыкоў: таго да школкі выправіць, улажыўшы яму у радняну торбачку кавалачэк хлеба ды дзьве, тры бульбачкі; другога пашле да панскаго двара на падзённую работу, каб зарабіў які-небудзь грош; а самых маленькіх, што ешчэ на запечку сідзяць без нагавіц, пазабаўляе і ў пору накорміць—напоіць, а калі трэба, то крыху і прыстрашыць...

У летку, управіўшыся каля хаты, Таклюся з усходам сонца сьпяшыць на поле жаць. Перш яна жне сабе, а потым, як падгоніць свой касьнік да палавіны палеткоў, наймаецца да багатых гаспадароў, або да панскаго двара, каб зарабіць сабе крыху грошэй на розну патрэбу.

Усюды, ці на сваёй, ці на чужой постаці, —Таклюся у рабоці перша; ніхто ня ўмее гэ-

так хутка і роўна жаці, як яна; ні ў кога сноп ня выйдзе гэтакім тугім і зграбным, як у яе.

— Ня жне, а грае!... кажуць людзі, зайздросьліва гледзячы на Таклюсіну работу.

У рабоці Таклюся мала гаворыць, больш маўчыць і аб нечым усё думае. Якая думка ляжыць у яе на сэрцы, ніхто ня ведае, але па яе вачах і па твару усякі можэ дагадацца, што думка гэта вельмі цяжкая і неадвязная. Іншы раз у Таклюсі зразу апускаюцца рукі, серп падае на зямлю, плечы выпростоўваюцца, і яна, уставіўшы ўперад, у сінюю мглу свае запаўшые вочы, пачынае горка плакаць; і сьлёзы буйнымі, круглымі каплямі коцяцца з яе вачэй на калючае ржышчэ.

— Бог с табой, Таклюська, чаго ты плачэш? дапытываюцца жанкі.

— Ах, мае вы сястронкі,—атказывае яна, як жэ мне, бяздольнай, не плакаць... Чым мае сіроты будуць жыць, як я памру? Па аднаму загону зямлі і таго кожнаму ня хопіць, а запасу у гаспадарцы німа ніякаго... Прыйдзецца ім, бедным, с торбай па сьвеці ісьці... Божэ мой, Божэ мой!..

Як толькі пройдуць гэтые, нет ведама скуль нахлынуўшые, цяжкіе, журлівые мінуты, —Таклюся зноў бярэцца за сваю работу, і зноў людзі дзівуюцца, як яна хутка і зграбна жне...

*
* *

Працавітая і надта разумная кабета Таклюся, але ня даў ей Бог добрай долі. Вельмі рана, чуць не на парозі жыцьця, спаткало яе нешчасьце. Як толькі выйшла замуж, а гэта было на восемнацатым року яе жыцьця, зараз

па шлюбе пан паслаў яе гаспадара на віціну, плытэ сплаўляць па Шчары ад Сloніма да Прусоў.

У той рок якраз надта рана пачалася зіма; ужо на Крыжа дуў с поўначы востры вецер і злетаўся сьнег, а с Пакроў пачалі замерзаць рэчкі. Плытэ па Шчары плылі ціха, з задзержкай і прыплылі на мейсцо ня ў той тэрмін, што трэба было павэдле дагавору. За гэту несправнасць цівун абвінаваціў Таклюсінаго гаспадара і, каб скараць, звялеў пасадзіць яго на тыдзень у лядоўню і кожын дзень, разлажыўшы на аполку, секчы розгамі у тры навароты. Гаспадар ледзьве жывым вярнуўся дамоў; і хоць пасьля гэтаго жыў ешчэ доўга, але работніка з яго добраго ужо у гаспадарцы не было: ён больш усяго ляжаў на печы і стагнаў ад ламоцьця, што гнула яго ў дугу і крышыло яму рукі ды ногі. І усю работу па гаспадарству прыйшлося выносіць на плечах аднэй Таклюсі...

Пашлі дзеці. Тут зноў беда: слабейшые уміралі, трэба было хаваць, а лепшэнькіх і дужэйшых, як толькі падрасталі, зараз забіралі ў маскалі, на Царску службу; і ізноў Таклюся-сухотніца аставалася адна на гаспадарцы і павінна была ўсюды сама пасьпеваць: і ў дома, і ў полі і на агародзі. Цяжкая доля, але што зрабіць? Паплачэ кабета, патужыць, пажаліцца людзям на сваю нядолю і зноў бярэцца за работу,—ідзе жаць, грабіць сена, або малаціць.

Кожын чэлавек, якое б не было цяжкае і цёмнае яго жыцьцё, заўсягды можэ знайсьці ў ім дзеля сябе нешта такое, што хоць на адну хвіліну асьвеціць і сагрэе яго сэрцэ. Быў

гэты Божы дар і ў Таклюсі: яна надта любіла лес, сіне неба і усю красу Божаго сьвету. Вясной, як толькі-што распусьцяцца дрэвы яна выйдзе сабе з сваей хаты абапрэцца каля варот на плетнік і доўга доўга любуецца маладым, адно-што распусьціўшымся ляском, што расьце за сялом, нідалёчка ад сялібы, або з вялікім напружэньнем слухае сьпевы салаў'я, ці кукаваньне зязюлькі. Стаіць Таклюся зачаравана красой маладой вясны, стаіць не шавеліцца, як прыкаваная і ніяк ня хочэцца ёй адарваць вачэй ад маладога зялёненькаго лясочку і ісьці у курную цёмную хату... Іншы раз гэта любаваньне веснавымі чарамі вызывае у Таклюсі смутак і канчаецца сьлезамі. Глядзіць сухотніца на зялёны лес, на сіняе неба і абліваецца горкімі сьлезамі.

— Чаго ты, Таклюська, плачэш? пытаюцца у яе суседкі.

— Ой, жоначкі, німагу вытрываць, ад цяжкаго жалю сэрцэ рвецца на кускі... Глядзіце, колькі на сьвеці ёсць красы, радасьці, ласкі і іншых Божых дароў, а людзі спавіты жалем, як поле туманам у восень, змучэны горэм, цяжкай бядой ды розным здзірствам...

— Гаспадар мой замучэны уміpae; вун Макрына, Кароцькава дзяўчынка, ляжыць колькі лет хворая, бяз ног; у дзеда Якуба стараста прадаў апошніх авечэк за неўплату падатку... Куды не ўзглянеш—усюды плач, сьлёзы, крыўда, зьнішчэньне. Людзі, як ваўкі душаць адзін другога. Дужэйшы, каб мог, гатоў слабейшаго утапіць у лыжцы вады...

— Божэ мой! дзе-ж праўда, любоў, ласка і радасць... І ізноў запаўшые вочы Таклюсі напаўняюцца горкімі сьлезамі...



Інв. 1953 г. 639786
БССР імені Леніна

Сама Таклюся не адукавана,—ня ўмее ні чытаць ні пісаць, але у другіх людзях адукаваньне надта высока цэніць і з усіх сіл стараецца, каб сваіх дзетак давясьці да розуму і зрабіць іх пісьменнымі. Як адно-што падрасьце каторы яе хлопчык, яна на апошні грош справіць яму лапцікі, пашые сермяжку і пашле да школкі з наказам:

— Глядзі-ж, сынок, слухай там настаўніка і добра вучыся, ды будзь асцярожны, каб чым не прашкопіцца...

Апрыч таго, яна вельмі любіць слухаць чытаньне і часта вечэрамі загадае сваім хлопчыкам у голас чытаці ей розные гісторыі

— „Пачытай мне, сынку, трошкі, бо надта мяне нуда апанавала: можэ крышку развеюцца мае чорные думкі“...

Адзін хлопчык, запаліўшы лучыну, сьвеціць, а другі бярэ кніжку і пачынае чытаць... Таклюся прадзе кудзелю і слухае. Але, каб добра чуць, што хлопчык чытае, ёй трэба надта моцна напрагаць слух, бо енк і стогны хвораго гаспадара, лежачаго на печы, ды завываньне на дварэ мяцеліцы перасіліваюць і глушаць слабы голас чытача.

Вот кончыў хлопчык чытаньне, звярнуў кніжку і заціх. Таклюся і кажэ:

— Здаецца я вельмі добра слухала, як ты, сынку, чытаў, а зразумець усяго ніяк не змагу: у гэтым тваім чытаньні ёсць многа чаго цёмнаго...

— Ты не сцікавіла усяго,—адказвае сын: бо гэта кніжка расейская...

— Скажы-ж, ты мне, сынок,—дапытваецца далей маці: ці не растлумачываў вам у школцы настаўнік, або бацюшка, чаму гэта нігдзе

німа кніжэк надрукаваных нашай мовай тэй што вось мы гаворым с табою?...

— Яны кажуць, што наша мова мужыцка: яе трэба забываць; у школцы нам не пазваляюць гаварыць па нашаму. Калісь я перэд вучыцелем абмыліўся і ў расказе заместа „кусок“ сказаў па нашаму: „кавалак“. Настаўнік стаў кпіць з мяне і назваў „лапцем“. Хлопцы доўга сьмеяліся...

— Божэ наш, дзівуецца сухотніца: у касьцелі гавораць па-польску і ешчэ па нейкаму, ў школцы ды ў валасным праўленьню парасейску, а чаму-ж гэта нідзе не гавораць панашаму?... Якіе-ж мы нешчасные; нам ня можна нават маліцца па-свойму; мы павінны забываць сваю родную мову... Дзе ж гэта праўда?..

Больш у гэты вечэр нічога не гаварылі. Патушылі лучынку, і ляглі спаць. На дварэ пад вокнамі усю ноч круцілася і выла, як адурэўшая, мяцеліца, а на печы цяжка стагнаў хворы гаспадар.

У гэту ноч Таклюсі сніўся вельмі цяжкі і страшны сон. Ей паказалося, што каваль, Пранук, перэвярнуўся у чорта, вырас ад зямлі да самаго неба і ў сваіх вялізных ручышчах дзяржыць вялізные абцугі, нагрэтые у гарне да чырваценя. Лапамі гэтых абцугоў каваль абшчаміў цэлую грамаду людзей і душыць іх, прыпекаючы, так што аж цела у небаракоў шыпіць і збегаецца у пузырэ.. Тут Таклюся надта спалохалася і раскрыла вочы..

— Згінь ты, мара, прападзі!.. шэптала яна, жэгнаючыся, і больш ужо у гэту ноч не змагла заснуць...

* * *

У нашых людзей ёсць шмат ешчэ чаго

ня вытлумачанаго і вельмі загадачнаго. Іншы працаўнік жыве ўсё сваё жыцьцё у калу ды ў бядзе, не бачыць праз сьлёзы Божаго сьвету, ў нудзе плавае, ў жалю захлебаецца; здаецца, гледзячы на гэтаго убогаго чэлавек, што ў душы яго апрыч думкі аб працы ды пракляцця на сваё цяжкае жыцьцё больш нічога німа. Але не: часта бывае, што у глыбокіх тайніцах сэрца гэтых забітых людзей жывуць вялікіе мысьлі і чуцьця, ахватываючые сабою долю ўсяго народу з усімі яго няўзгодамі і пажаданьнем.

Вот гэткая і Таклюся: жыве у бядзе ды ў цемнаце, працуе як вол пад ярмом, а мысьлямі абыймае жыцьцё усяго свайго народу і хочэ разгадаці усе тайніцы яго долі і ведаць яго будучыну.

Перэд Таклюсяй цяпер неразгаданнаю загадкаю стаяло тры цікавых пытаньня:

Першае: калі паміж людзьмі будзе праўда?

Другое: ці дадуць калі-небудзь беднякам зямлі?

Трэйцяе: калі ўсім людзям пазволена будзе вучыцца і маліцца на сваей роднай мове?

Гэтые тры пытаньня гострым клінам забіліся ў галаву Таклюсі і яна ніяк ня можэ ад іх адвязацца. Як цені яны усюды ходзяць за ею і просяцца на разгадку.

— Каб найшоўся-б які-небудзь мудрагель. —гаворыць яна сваім суседкам,—і растлумачыў мне усё гэта, як трэба, можэ у мяне палягчэло-б на душы, а то надта цяжка.

І як толькі сустрэне Таклюся якога небудзь старога маскаля, або жэбрака, ці пісьменнаго старца зара заклічэ яго да сябе і пачынае дапытывацца, калі людзям будзе лепш

жыць на сьвеці. На гэта Таклюсіно пытаньне адны маўчаць і цяжка ўздыхаюць, а другіе гавораць надта многа, але ешчэ ніхто сваей адповедзьдзю не прывёў яе да поўнаго здаволеньня.

**К. Лейко.**

# СТАРАЯ БЕЛАРУСЬ.

## ЛЕТАПІСЕЦ.

„Душой стаміўшыся ў жыцьцёвых цяжкіх бурах
Свой век канчаю я ў манастырскіх мурах
І пільна летапісь другі ўжо год пішу:
Старанна літэры малые вываджу
І спісваю усё ад слова і да слова
З даўнейшых граматак пра долю Магілёва.
І добрые яго і кепскіе дзела
Апаведаю тут. Так рупная пчэла
Умее ў соты мёд сабраць і з горкіх кветак.
І бачэннаму мной—я годны веры сьведак.
Хай тые ведаюць, што з'явяцца па нас,
Ўсю праўду пра жыцьцё у наш і пройшлы час,
Пра войтоў, лаўнікоў, і райцоў і паспольства,
Пра розных каралёў і бітвы і пасольства.
Што тут чынілося у даўные гады,
Што думалі, чаго бажалі мы тады,
За што змагаліся, як баранілі веру,—
Хай зьведаюць усё патомкі праз паперу!
Яно забудзецца, умрэ, з вадой сплыве,—
І вось у спомінах устане, ажыве,
Калі знайдуць маё ня хітрае пісаньне
Пра гэтае жыцьцё, надзеі, спраўаваньне.

Так морэ—ў Гданску я чуваў—прымчыць вадой
Бутэльку к берэгу, аблітую смалой,

Ўсю ў дробных ракоўках і ў ціне. Не замала
Яна была ў вадзе і шмат чаго спаткала.
Рыбалкі вылавяць бутэльку, разаб'юць,
І, як трапляецца, быць мо́ у ёй знайдуць
Ліста. Па звычаю марскому гэтак весьці
Нам, утапаючы, шлюць людзі. У моры гдзесьці
Загінулі яны, і, можэ, соткі год
З тых часоў працяклі, і згінуў іх народ,
І ўсё зьмянілося і ўжо пра іх забылі.
Вы, літэры, цяпер нанова ўсё збудзілі!
І людзі зьведаюць аб прадзедах сваіх
Аб горы, радасьцях і аб прыгодах іх,
Чаму маліліся, чаго яны шукалі,
Дзе на глыбокім дне іх крыюць мора хвалі".

## ПЕРЭПІШЧЫК.

На чыстым аркушу прад вузенькім вакном
Прыгожа літэры выводзіць ён пяром,
Ўстаўляючы паміж іх чорнымі радамі
Чырвоную страку; усякімі цьветамі,
Рознакалёрнымі галоўкамі зьвяроў
І птах нявіданных, спляценьнем завіткоў
Ён пакрашае скрозь—даволі ёсць знароўкі—
Свае шматфарбные застаўкі, і канцоўкі
І загалоўкі ўсё,—німа куды сьпяшыць!
Парой ён спыніцца, каб лепі загастрыць
Пяро гусінае, і гляне:
сьветла сонцэ
Стаўпамі падае праз вузкае ваконцэ
І круціцца у іх прыгожы, лёгкі пыл;
Як сіневаты дым нявідзімых кадзіл
Рой хмарачэк плыве; шырокімі кругамі
Шчасьліва ластаўкі шыбаюць над крыжамі
Як жар гарашчымі; а тут, каля вакна,
Маліноўка пяе і стукае жаўна.

І зноў ён схіліцца, застаўку зноў выводзіць
Не яркім серабром; нячутна дзень праходзіць,
Ўжо хутка будзе ноч і першая гвезда
Благаславіць канец прыгожаго труда.

## СЛУЦКІЕ ТКАЧЫХІ.

Ад родных ніў, ад роднай хаты
У панскі двор дзеля красы
Яны, бяздольные, узяты
Ткаць залатые паясы.
І цягам доўгіе часіны,
Дзявочые забыўшы сны,
Свае шырокіе тканіны
На лад пэрсідзкі ткуць яны.
А за сьцяной сьмяецца поле,
Зіяе неба з-за вакна—
І думкі мкнуцца мімаволі
Туды дзе расцьвіла весна,
Дзе блішчэ збожжэ ў яснай далі,
Сінеюць міла васількі,
Халодным срэбрам з'яюць хвалі
Між гор ліючэйся рэкі,
Цямнее край зубчаты бора...

І тчэ, забыўшыся, рука
Заміж пэрсідзкаго узора
Цьвяток радзімы васілька.

## КНІГА.

Псалтыр, пакрытую няжорсткай, бурай кожай
Я ўзяў і срэбные засьцёжкі адамкнуў,
Перэчытаў рады кірыліцы прыгожай,
І воску з ладанам прыемны пах пачуў.

Вось псальма зьлічная: „Як той алень шукае
Крыніцы чыстай, так шукаю Бога я“.
Як вее сьвежасьцю яе краса жывая!
Як радасна ўсё дальш сьпяшыць душа мая!

I бачу я ў канцы ня хітрую прыпіску,
Што: „кнігу гэтую раб Божы дзяк Гапон
Дзеля душы спісаў у месту Волкавыску
У рок (сем тысяч сто васьмы) с пачатку дзён“.

**Максім Богдановіч.**

*Яраслаў.*

# Думкі.

Вот ужо і касу гострыць бацька—прыгатаўляецца да казьбы. І твар яго вясёлы і усьміхаецца сам да сябе... „Вось, дачушка, я буду касіць, а ты з грабелькамі прыйдзеш“,— „Прыйду, татачка, прыйду“...

Бедны мой татуля! Ты ужо нарыхтаваўся да казьбы, ужо бачыш, як тоўстымі пракосамі кладзецца трава, як сьвішчэ каса у яе гушчы! Гострыш касу і бачыш, што многа ужо ты скасіў, а сонцэ толькі збіраецца аглядаць зямлю сваім сьветлым вокам Праз момэнт яно паслало сваіх ласкавых слуг будзіць усіх да работы. Усьміхнууся лес, каплі расы блiснулі, як вочкі пекнай дзяўчынкі; на ўсе галасы адазваліся птушкі, пчолкі сталі цэлаваць красачкі. Усім зрабілося неяк вясёла! Вясёла і ў цябе працаўнік на душы, вясёла слухаць, як пяе твая каса! Шмат ужо гадоў ты чуеш гэтые сьпевы, многа красачак панікло галоўкамі ад тваей рукі! Але ня з злосьцю—з вялікай жальбой ты караціў ім век: заўсягды былі яны табе любы! Ці раз ты цэлымі гадзінамі любаваўся, як цьвіце канюшына, як вясёла гудзяць чмялі. Бывала прыбягу я: „Татачка, Зьміцер прыйшоў“, а ты кажэш:—„Ніхай, сынок, пачэкае“ і, пасадзіўшы мяне на калені сабе, глацзіш сваей мазалістай рукой льняные мае валаскі і шэпчэщ: „глядзі, Алеська, як красачкі цьвітуць, як мушкі з імі гавораць“.

Я прыхілюся к табе галавою і неякая жаласць бярэ, хочэцца плакаць. .

Родненькі мой, гаротнік дарагі! Ты прыбіраешся ахвотна да цяжкай працы, але колькі трэба нашапкаваць, пакуль вымаліш кавалак сенажаці? ці ты забыўся, што сваей хопіць толькі да сьнеданьня. Ён палажыў касу, усьмешка знікла, пабялеўшые вусны нешта шэпчуць. Аб чым ты задумаўся? Што гэтак моцна ўскалыхнуло твае думкі? Можэ ціжар работы цябе страшыць? „Тата! можэ ты захварэў, што гэтак раптам зрабіўся бледны? Ідзі атпачынь крыху!“—«Не, я ня хворы! Але што мы будзем касіць?..

Неякая жальба сціснула маё сэрцэ, нешта гарачае пакацілося па твары. Даражэнькі мой татачка, Богам забыты Беларус! Чаму нядоля гэтак крэпка дзяржыць цябе ў сваіх кіпцях? Чаму ты, бяздольны, не крычыш на увесь сьвет, не гукаеш аб сваіх нясцерпных муках? Крычы, ва ўсе грудзі! А калі ты сам ні мэеш сьмеласьці, ці ня ўмееш, дык чаму гэта ня зробяць твае сыны? Чаго яны маўчаць? Яны мусі забыліся, як бацькі іх пякуцца, а можэ ім стыдна прызнацца, што яны беларусы? Калі гэтак, дык нашто ты, маці Беларусь, карміла іх сваім хлебам, паіла сваею вадою? Нашто бацька прадаваў апошнюю кароўку ды іх вучыў? Ці-ж толькі на тое, каб яны адзелі чорну апратку, забылі сваю мову, забылі бацькоўшчыну?

Маці Беларусь! Ці доўга ешчэ над табой будзе панаваць цёмная ноч, ці доўга ешчэ будуць чурацца цябе твае сыны???

**А. Калпак.**

# ЦМОК.

*Беларуская легенда.*

Дужа і дужа даўно гэта было; можа сто, можа дваста, а можа і болі гадоў.

Жыў у вёсцы Стрэльбы адзін старык; хто ён, аткуль—ніхто ня ведаў; звалі яго Сёмкам. Колькі гадоў меў Сёмка, ён і сам ня мог успомніць, бо ўжо дужа, дужа стары быў.

Прыйшоў сакавік, сталі мужыкі далотамі прабіваць і сьвердламі пракручываць дзіры у бярозах ды у клёнах, устаўлялі у дзіры латочкі і па іх пускалі сок у жбаны. гаршчкі—і поўнымі судзямі прынасілі дамоў, вялікіе кублы налівалі яго. Хто колкі хацеў,—пілі праз пост і ешчэ аставалося на вясну і лета.

Дужа многа ад гэтаго дрэў прападало марна. Бяроза на пагляд—цацка, а у сяродку адна парахня. Шкада стала Сёмцы дрэвоў і кажэць ён мужыкам: „Вот налійце бочку соку ды памацней забійце дно і ня рушце яе праз цэлы год“.

Мужыкі паслухалі Сёмку, бо ўжо дужа шанавалі яго.

Прайшоў год, Сёмка і кажэ: „Ну цяпер бярыце бочку с сокам і каціце падалей на папарнае поле і як можна больш збярыце мальцоў, ніхай кожны маець у руках якую небуць уручыну; калі бочку разабьеце адтуль папаўзуць рожные гады і вужакі; глядзіце; бійце

ўсіх, каб ніводная не ўцекла, бо дужа вялікая беда з гэтаго можэ здарыцца".

Сабраліся людзі з усей вёскі, хто з аглоблінай хто с перэкладзінай, хто с памялом, а хто з рыдлям--бытцым на вайну. Бочку аткацілі далёка на поле на роўнае мейсца і разбілі.. Божухна мой, што толькі яны не ўбачылі: якіх там гадоў, вужакоў, жабоў, яшчуркоў не было! і кожная туравілася, каб хутчэй папасьць у лес ці у балота.

С пачатку людзі спужаліся, ажно каторые рынуліся уцекаць, але пасьля апомніліся і давай лупцаваць усю гэтую шпэць.

Доўга білі, здаецца усіх перабілі.

„Ну што, цяпер вы убачылі, што у соку ёсць і што вы пілі!" сказаў Сёмка.

С таго часу стрэльбянцы перэсталі пускаць сок, а дзеля гэтаго і лес стаў папраўляцца.

Прайшоў год, прайшоў і другі, на Юрью выгналі скаціну ў поле, і як вядзецца, абкурылі яе зёлкамі, а самі мужыкі пряняліся за вясноўскую працу. Аж неяк гэта праз тыдзень у Ірмака прапаў ягнёнак. Усё поле, усе кусты паабшукалі, а ягнёнак бытцым скрозьдонна праваліўся. Прайшоў ешчэ тыдзень і у другога гаспадара прапаў ягнёнак. Як ні шукалі і гэтаго не знайшлі Праз месяц згінуло тры ягнёнкі і парасё. Мужыкі закраталіся, сталі вартаваць ад лесу, бо думалі, што гэта ваўкі; як ні пільнавалі—ваўкоў не бачылі, а парасё ешчэ адно прапало, а за ім і другое. Як ня біліся, як ні ламалі галовы, як ня рупіліся мужыкі злавіць злодзея, нічога зрабіць не маглі. Сёмка стаў саўсім маркотны і нечэга хадзіў

па папарнаму полю ды усё прыглядаўся у балота. Чаго ён шукаў — нікому нічога не казаў.

Неяк пастухі пад Жвіранкай (гара з жвіру) гулялі у цуркі, а быдла хадзіла каля балота; ажно чуюць яны, як запішчыць парасё, ды так страшна, што усе чатыры яны разам пабеглі туды, скуль чуваць быў зык парася і круханьня сьвіньней, і бачаць, што нехта, дужа страшны, бытцым вялізная вужака, але з лапамі, як у яшчаркі, доўгі і тоўсты, як балька, а праз усю хрыбеціну, як у ірша, высокі грэбень, у бальшушчай ляпі трымаў за зад парасё і поўз у балота, а хвастом праганяў сьвіньней, што хацелі адбараніць парасё.

У той-жэ час пастухі пабеглі у вёску і расказалі сваім гаспадаром. Сабралася уся вёска прышоў і Сёмка ды і кажэ: „Казаў я вам, каб усіх вужак пабілі, каторые былі у бочцы с сокам, але відаць вы не дагледзелі і адна уцекла і схавалася у балоці. Беда цяпер будзе вам, бо гэта цмок, яго ніхто ня можэ забіць, апрыч сьвятога Іллі“.

Мужыкі і вушы павесілі, а кабеты разрымзаліся, бо усе ведалі, што цмоку мала будзе ягнят ці парасят, а захочэ і кароў ды і людзьмі не пачураецца.

Неўзабавак усе уцікавілі, што надта часта бьець с пяруна пад Жвіранкай, хоць сабе саўсім маленькая хмарка найдзець, а с пяруна разы тры ударыць.

Прайшоў ешчэ год, многа быдла папрадала у стрэльбянцоў, а на чацьвёрты год у Яські прапаў і пастушок. Стрэльбянцы, Гайсіляўцы і з другіх вёсак пэрэсталі хадзіць і ездзіць па дарозі праз Жвіранку, бо баяліся, каб не спаткацца с цмокам.

Цікавы дзяцюк Юрка даўно ужо збіраўся паглядзець на цмока, але усё неяк не выпадала, усё страшна было. Толькі у адну нядзелю, закінуўшы стрэльбу на плечы, пражагнаўся і пайшоў ешчэ да поўдня. Абыйшоўшы з другога боку Жвіранку, ён стаў з-загары прыгледацца на маленькае балоцітка, дзе жыў цмок. Якраз у гэты час надыйшла тучка; цмок вынырнуў з вады, стаў ракам, выставіў зад і давай балбатаць у вадзе; загрымеў гром, цмок ў тую-ж хвілю нырк у ваду, а с пяруна і трах, але нічога; цераз мінуту цмок ешчэ вынурнуў і давай балбатаць, а як загрымеў гром, дык нырк ў ваду і схаваўся. Разы тры так рабіў, разы тры біло с пяруна—нічога Ведама, што ні пярун, ні куля. ні стрэла у вадзе не бярэць.

Юрка глядзеў, глядзеў і бачыць, што цмок дражніць сьв. Іллю, узяў стрэльбу і як цмок паказаўся з вады—бах у яго, цмок спужаўся, падумаў, што гром і нырнуў у ваду, але зара уцяміў, сваю абмылку і ізноў вытаркнуўся, але у тую хвілю, як ён хаваўся, праграмеў гром, а як вынырнуў, ударыў пярун і якраз па ім; цмок перэвярнуўся да гары адзін раз, другі, і хацеў ужо перакульнуцца у большае балота, каторае было шагоў за дваццаць, ажно, як трэсьнець другі раз с пяруна, дык ён і расцягнуўся; а Юрка учуў з неба толькі адно слово: „дзякуй“.

Многа, дужа многа пераходзіло народу паглядзець цмока, толькі ніхто ня мог вытрываць: як паглядзіць, дык нудна станець, аж на ваніт бярэць, бо цмок той дужа ужо брыдкі і смуродны быў.

Колькі разоў закапывалі цмока у зямлю, але зраньня ізноў знаходзілі яго на вярху.

Як ня біліся, як ні мардаваліся, прыхадзілі з другіх вёсак памагаць,—нічога не маглі зрабіць.

Убачыў Сёмка, што шпэтны рэчы і кажэ мужыкам: „Сабярыце дванаццаць дзяцюкоў ні старэй дванаццаці гадоў і дванаццаць жэрабцоў, ешчэ ні разу не запрэганых, ніхай яны закапаюць цмока, але каб у адзін дзень“.

З далёкіх вёсак прышлося збіраць мальцоў і жэракоў, але затое яны у адзін дзень закапалі цмока.

Раз у нядзелю Сёмка, спаткаўшы Юрку, сказаў: „Прабачайце мне, многа я бяды нарабіў вам, хоць і не хацеў“, а сам пашоў у Краслаўку. С таго часу ніхто яго больш не бачыў.

Да гэтых пор ешчэ ёсць пагурак над Дзьвіной, што быў накапаны над цмокам; вялікае балота, выгарэло у сухое лета і прызываецца „Выгаркай“, а малое, дзе жыў цмок, і цяпер паўнюсенькае вады, толькі пазарасло мохам. Кажуць, што ад яго аж у Прысьвяцкае возера, на пяць вёрст, ёсць лёха, за тое у ім вада дужа сцюдзёная.

**Л. Гвозд.**

# Думы ў чужыне.

Горэ мне цяжкае, горэ безсчаснаму!
Сэрцэ ўсё жаліцца, плачэ, баліць.
Хочэцца к сонейку цёпламу, яснаму:
— Хоць бы убачыць!— Ўсю цягасьць зваліць.

Доля мая, што мяне узбагаціла,
— Думак, жаданьнёў і сэрцэ дала,
Недзе гама́н з маім шчасьцем утраціла,
З горэм падняла і мне падала.

---

Што там на перэдзі, што там незнанае,
Што там са зьдзекам мяне, сьцеражэ?
— Скрытна-варожжае, з страхам чэканае,
Можэ і блізка на нейкай мяжэ.—

Толькі ня сьмерць,—не аб ёй неспакоюся;
Сьмерць гэта што! Гэта дар для усіх.
Прыйдзе мо час і я з ёй заспакоюся
Збыўшыся болёў і думак сваіх.

Іншае горэ душу абціжарыло,
(Камень цяжэйшы на сэрцы ляжыць),
Дні майго разквіту мглою абдарыло,
У жыцьці штодзенне за мною бяжыць.

— Доля мая, гэта доля гаротная,
Сэрцэ дала мне, наўчыла любіць
Дый прысудзіла яна-ж, адваротная,
Век у сіроцтве, ў выгнаньню пражыць

Што мне жыцьцё, хоць бы самае краснае?
— Волі німаю! Ў няволі жыву.
Гэтае нуднае быцьце уласнае
Сьмерцьцю страшэннаю з болем заву.

Сокалам вольным і з пташшай гульлівасьцю
Я-бы здаецца адсюль паляцеў...
Нельга і думаці,—доля бяз міласьці
Варту паставіла. Вораг абсеў.

---

Беднасць—ня горэ саўсім мне безскарбнаму.
Я багацей, замажней, за другіх.
І не зайздрошчу багацтву тых марнаму,
Досіць з мяне бедных злыднёў маіх.

Покі варушацца рукі скарэлые,
Праца мне будзе, на радасць на сьмех.
Злотам багатые, сэрцам зніпчэлые,
Трутні ня мецымуць гэткіх уцех.

Што мне багацтво? Бяз грошы, бяз золата,
Быў-бы магнат я, кароль, багатыр,
Там, дзе пад націскам роднаго молата
Жыцьце куецца у глыб і у шыр.

Жыцьце куецца і сонцэ ўздымаецца,
Сьвету праменьня ліець з гарыні,
З доўгаго сну дзе народ прачыхаецца,
Побыту шчаснаго сьвецяць агні.

Там, дзе цяпер ешчэ сілы нячыстые
Жыцьце карэжаць, па свойму вядуць.
Дзе ўстрэпянуліcь дубы густалістые
І на курганах нямоўчна гудуць.

Можэ і я з сваёй слабаю сілаю
Там працаваці бы крышку памог;
З гэтаю працаю шчыраю, мілаю,
Сьмерці спаткаў-бы спакойна парог.

Можэ... А можэ не ўбачыці гэтаго?
Можэ суджона тут век мне пражыць?
Дні адзіноты, сіроцтва бязсьветнаго,
Грудай каменьняў ў душэ валачыць.

---

Страшна мне гэта і ўсё-ж не ядынае
Так навалілась, гняце ў глыбіне.
— Есць-жэ горшая мука—што сынам я
Быць перэстану сваей старане.

— Памяць ня доўгая, любасць ня вечная;
Сірасць, бязлюднасць,—іх трудна нясьці;
Мо, пажэгнаўшыся з старым на вечна я,
З шляху звярну, па другім каб ісьці.

Страшна мне нават аб гэтым і згадываць,
Страшна і думаць, і я не хачу.
Толькі-ж надзеі не маю, чым зрадаваць
Сэрцэ і сьлёзы ссушыць у вачу.

Вось у чым горэ бадзязе безсчаснаму,
Вось чаму сэрцэ маё так баліць,
Вось чаму хочэцца к сонейку яснаму.
— Хоць-бы убачыць—тым цягасць зваліць.

---

Цяжка мне, праўда. Ці-ж трэба мне жаліцца?
Цяжка-ж другім—іх мільёны усіх,—
Жыцьце іх рушыцца, бьецца і валіцца,
Гінуць надзеі і думкі у іх.

Многа на сьвеці усякага творыцца!
— Многа хто вершаў аб гэтым злажыў—
Часам паслухаеш, хто разгаворыцца,
Бог яго ведае як ешчэ жыў?

Біўся з няпраўдай, з бядой і гаротаю,
Сэрцэ у попел нешчадна спаліў,
Сілы ўсе страціў у бойцы с цямнотаю
Кроў не рахуючы! Кроў сваю ліў!

Што-ж тады плакаць мне маладзейшаму?
Я-ж не прайшоў іішчэ пуціну сваю:
Сэрцэ асталося. Не, весялейшаму
Трэба мне быць, а я плачу—пяю.

## Навакол...

Сьнягі, ляды,
абраз жуды,
на заўсягды,
на вечны час
ляглі.

Гара, скала,
наўкол легла
і узрасла.
— Паўскрайны пас
зямлі.

Узрос на ёй
вялізаў хвой,
туману з мглой
прытулак, лес
стары.

І разам з ім
на жах благім
і добрым, ўсім,
тужлівы сьпеў
вядуць:

„Засьні, засьні,
„У ноч ўсе дні
„перэмяні
„і нас ня гнеў,
„ня гудзь.

„Скалей, як лёд
„на сотні год
„і сэрца лёт
„спыні. Вярні
„да сну.

Прадзіўны мур
нярушных хмур,
як той каптур
на бор узлез
з гары.

І сонца сьвет,
здалёка, з гэт,
нябёс прывет,
ня здужыць к нам
дайсьці.

Адны вятры
праз хмар муры
лятуць з гары,
праз лес той сам
гусьці.

„А сонца сьвет,
„здалёка, з гэт,
„з нябёс прывет
„—мана. Жэні
„ману.

„Жэні. Раі
„тых дум спыні
„і жаль счаі,
„і кінь з пяшчот
„у цемнь“.

„На сьвет адны
„твае паны
„і вартаўны
„табе пачот,
„—то-ж мы“.

*Сыбір.*

**Алесь Гарун.**

# Рабы Міхась Крэчка, што быў за судзьдзю.

(*Маленькая гісторыя памяці Гіполіка Малчановіча з Івенца.*

I.

Я як-бы ведаў, што вы пацікавіцеся, аткуль наш судзьдзя, хто яго бацькі, ці мае ён жонку, ці вялікіе дзеткі, ці добрые у яго суседзі, дык і пачынаю сваю гісторыю с канца.

Міхась Крэчка, як усе добрые людзі жыве у Пустоўскай воласьці. А калі запытаеце дзе гэта пустоўская воласць, то я вам параджу вельмі далёка не шукаць гэтаго мейсца— яно саўсім блізка каля вас: ідзіце усё прама і як толькі спаткаеце многа сабак, а вуліцы крыж-накрыж, то вы ўжо і прыйшлі у Пустоўку. А калі сабака ірване вас за ікру, або палатае сермяжыну і усім целам сядзеце у ямі-ну, так і ведайце, што гэто ужо бацькаўшчына Міхася Крэчкі. А калі да вас падойдзе карчмар і скрывіўшы плечы паклічэ у шынок, то ўжо лічыце сябе у доме Крэчкі. Цяпер мне здаецца, што дарогу у Пустаўку добра ведаеце і не заблудзіцеся: ідзіце усё прама і глядзіце найбольш у зямлю і па бакох, каб не было з вамі якога злога выпадку.

А далей мусі трэба вас пазнаёміць і з самымі пустоўцамі. Людзі гэта ня кепскіе;

аруць, сеюць, носяць сермягі і робяць усё, чаго іх бацькі навучылі, але калі другі, барані Божэ, вымкнецца у чым ды спракудзіцца, то гэткаго доўга памятаюць, ды і сваім дзеткам нават раскажуць:

—„...Вось быў Ігнась разумны і папаўся“...

Але ня думайце, што у Пустаўцы німа людзей з мазгамі. Ого! Тут ёсць такіе, што па кусочках разгледзяць, разбяруць вас, а пасьля скажуць:—„даруй, Божэ, нам нашы грахі“..—І усё-ж у Пустоўцы ніхто двох вякоў не жыве, а пакуль стаіць сьвет, кажуць яны, і ёсць гарэлка, а суды судзяць, то і піць трэба.—„С панам, с ксяндзом піць ня будзеш, а с сваім братам судзьдзёй як ня выпіць?!—Кепска, добра судзіў—усё роўна—пій пакуль не паваліішся і годзі!

Уселякіе людзі бываюць у Пустаўскай воласьці. Адзін, як выпье лішню чарку, пачынае плакаць, як бацьку пахаваўшы, а жонкі і дзяцей ні на вочы не пускае і бье, калі пападуцца пад руку. Другі—лезе цалавацца і каб білі яго, усё-роўна лезе.—„Бій, ну, бій,—прычэпіцца ён да чэлавека,—а ўсё-ж такі дай пацалуемся!“—Вельмі дрэнна на сходах з гэткімі людзьмі: крычаць ажно горлы трэшчаць, а толку ніякаго.

Наш пісар-вялікая галава—ён кажэ, што мужыку трэба найбольш маўчаць, бо галава у яго сядзіць так сабе, а увесь фундамэнт у руках! Людзей, што на сходах аказываюцца—называе проста „крыкунамі“ і саўсім іх ня любіць. Як бывае у добрым гумары ён гэтак кажэ:—„каб уся зграмада была, як тые крыкуны, то перш за ўсіх яму, пісару трэба было-б уцекаць з гэтаго сьвету, а пасьля і усім

добрым людзям. Убачылі-б тады крыкуны, як жыць бяз пісара і усе-б жывымі у зямлю палезьлі“.—Але ня ўсе-ж на адзін капыл роблены. Пісар не нацешыцца с тых людзей, што на сходах другіх слоў не маюць, як:—„але, паночку“,—„гэтак трэба“,—„сагласны, усе сагласны“. Добрые гэта людзі: патаўкуцца, папіскаюцца пасьля сходу і ідуць сабе дамоў, калі і нічога пісар не даў на гарэлку,—ня то, што „крыкуны“, бывае што прыстане другі:—„дай пан на гарэлку, ей-Богу дай“, пасадзіш яго за рашотку ён пасядзіць і ізноў просіць „дай, паночку, дай хоць на чарачку“. Дасі яму атчэпнаго і усё добра. І гаспадар ты, пісар, як ёсць над усімі у воласьці. Старшыню, старасту, судзьдзю—усё ты сам выбіраеш. Ведама „крыкуны“ мала дзе патрэбны, а ціхога чэлавека чаму не узяць для службы: гэткі, брат, што не падложыш—падпішэ. Шкоды ад яго нікому ня будзе, а што выпье—яму на здароўе.

II.

Калі падыйшоў час выбару судзьдзі, усе сходзіліся на тым, што ня будзе ніякай бяды, абабраўшы Міхася Крэчку. Нават мала крычэлі, бо пісар ведаючы усегдашнюю прыказку Крэчкі:—„язык да дабра не даводзіць“—зараз жэ прыгаварам зацьвярдзіў выбары.

І прычапіўшы медаль Крэчка не зафанабэрыўся: спаў на печы і еў разам з жонкаю і пастухом. У апратцы усё асталося старое, адно новые завяліся боты, што абуваў на суды. Ніколі ён не хваліўся, як другіе яго калегі:—„мы прысяжные, мы прысяжные“, а быў добрым хлопцам і браў, што давалі без уселя-

кай спрэчкі. Ён ня быў гэткім мудрым, як сам прадседацель суду, каторы прыдумаў цацку з дзірачкай. Прадседацель лічыўся не абы якім чэлавекам: Бога баяўся, спаўняў прысягу. — „Усё трэба рабіць па хворме—казаў ён —Божэ барані, калі рука мая возьме грош, суд—сьвятая рэч“. Але усім было ведама, што у прадседацеля ёсць у стале скрыначка з дзірачкай і калі у яе кінуць што, то пэўна нідзе не прападзе апрача кішэні прадседацеля. Хто гэтаго спосабу ня ведаў і прама саваўся з грашыма к прадседацелю, ён ад яго уцекаў с хаты, а ужо жонка аткрывала сэкрэт, што прысяжны не бярэ; а калі чэлавек мае што, то можэ кінуць у скрыначку—і грэху ня будзе і дзела споўніцца.

Наш Крэчка, як ведама быў добрым хлопцам, але як зрабілі яго начальнікам, то Прануся, яго жонка, цяжка ўздыхнуўшы сказала:

— „...Глядзі ты, Міхась, ну!“

У яе недакончэнай думцы так і чулася нейкая беда. Але хто слухае бабы? Сьмеяўся і Міхась с сваей кабеты. У судзе ён убачыў, што дзела не саўсім проста: яго сябры бяз гімароў кроку ня зробяць, ды і земскі нос суне у мужыцкіе справы і цісьне суд. Адна беда. Сядзі увесь дзень без падмочкі аж галава круціцца.

Дзякуй Богу халера пашла і такі вышоў прыказ: „Халоднай вады ня піць“. Тады пажылі. На судох стаяў самавар, як-бы с перэварэнай вадой, а налівалі яго спіртусам. Адзін раз сядзеў на судзе земскі, а наш галава прадседацель звертаецца да яго і кажэ:

„Вашэ скародзіе, ці можна напіцца?“

— „Кіпячонай вады?“

— „Так точна“.

— „Ідзі - кажэ — гэта можна“.

Пацягнуў ён, а за ім і усе мы.

І рэвізіі гэто—абрыда... — А па нашаму самы большы фэлер, калі прадседацель гарэлку с півам мешае—ну, але, бо мала выпье і упьецца.

III.

Службу сваю выпаўняў Крэчка, як зносіла яго галава. Глядзеў ён аднаго, каб як небудзь ад таварышоў не адстаць, ды рабіць, што яны робяць. Гэтак служачы, мы ужо думалі, што да самай сьмерці не разстацца Крэчцы са сваім судзьдзёвым медалям, але выйшло саўсім іначэй і гэтак, як мусі жонка Пранися спадзевалася. Ды ешчэ як! Згубіў чэлавек не аднаго сябе, а увесь Пустаўскі валасны суд. Гэта было як усе пустаўскіе судзьдзі за мястэчкам у гаі гулялі „лета“. Усё-б добра абышлося, каб не адна беда. Нялёгкае, якраз, прынясло у гай і земскаго. Ходзіць сабе ён памаленьку па лесі, чуць ногі цягне і, якраз, нічога ня ведаючы, ідзе на тое мейсцо, дзе сябры зарабіўшы на судзе грошы гуляюць. Ён-бы найшоў на самую бяседу, каб не прадседацель каторы адлучыўся на бок. Убач прадседацель земскаго перэд пачаткам выпіўкі, ён-бы ня скеміў, што рабіць у гэткім страшным часе і, як акамянелы, стаяў бы пакуль земскі не ўзяў-бы за вуха і не адвёў-бы за рашотку, але цяпер ён зразу ірвануўся з мейсца і, як стрэла, паляцеў да падводы. Усе кінуліся за ім і, штоўхаючы адзін другога, як-небудзь паўлазілі на воз; адзін толькі Крэчка, найгорш спалоханы, як непрытомны круціўся каля калёс і ад страху ніяк ня мог сесь-

ці. Сабраўшы апошніе сілы, ён гэтак скакануў, што не зачапіўшы пятамі ваза, пераляцеў на другі бок фурманкі, а сябры яго, думаючы, што ўсе на вазе, маланкай панясьліся ад благога мейсца. Тымчасам выйшоў земскі на дарогу, а там і Крэчка...

Цяпер можэце дагадацца які быў канец: злосны земскі у тры мігі раскасаваў увесь пустаўскі суд.

І што ж вы думалі?

Ізноў наш Міхась Крэчка, катораму усьміхнулася доля і абула у боты, надзеў пранавечные лапці і па стараму топае на сходзе перэд панам пісарам дабіваючыся чаркі гарэлкі.

**М. Кепскі.**

# Лесьнікова пасада.

*(Адрывак з расказа „Новая зямля").*

Мой родны кут! як ты мне мілы!
Забыць цябе не маю сілы.
Не раз, утомлены дарогай—
Жыцьцём вясны маей убогай—
К табе я ў думках залетаю
І там душой адпачываю.
О, як бы я хацеў спачатку
Жыцьця дарогу папарадку
Прайсці ешчэ раз, азірнуцца,
Сабраць з дарог каменьні тые,
Што губяць сілы маладые—
К вясьне-б маей хацеў вярнуцца!
Весна, весна! не для мяне ты:
Не я, табою абагрэты,
Прыход твой радасны спаткаю;
Цябе на век, весна, хаваю.
Назад ня прыйдзе хваля тая,
Што з быстрай рэчкай уплывае.
Не раз яна, зрабіўшысь парай,
На крыльлях сонца зойдзе хмарай
Ды зноў дажджом на рэчку зыдзе—
Ніхто з граніц сваіх ня выйдзе,
З законоў, Богам напісаных,—
Або на дол спадзе ў туманах;
На дол вадой ці сьнегам ляжэ?...
Але хто нам яе пакажэ?
Ня вернешся, як хваля тая
Ка мне, весна ты маладая!

Вось як цяпер, перэдамною
Ўстае куточэк той прыгожэ,
Крынічкі вузенькае ложэ!
І ёлка ў пары з хваіно́ю,
Абняўшысь цесна над вадою,
Як маладые ў час каханьня
Ў апошні вечэр разставаньня.
І бачу лес я каля хаты,
Дзе ко́лісь весела дзеўчаты
Сьпевалі песьні дружным хорам
З работ ідучы позна борам.
Нясьліся зыкі песень здольных,
Ў лясох раз-по́-раз адбівалісь;
Ім ўсюды ўзгоркі атклікалісь,
І чулась радасць ў песьнях вольных.
А хвоі, ёлкі векавые,
Пад зыкі песень маладые,
Маўчком стаялі ў сумнай думе,
І ў іх ціхусенечкім шуме
Няслось вячорнае маленьне
Ў гару, сьвятое аддаленьне.
Каля пасады лясьніковай
Цягнуўся зграбнаю падковай
Стары высокі лес цяністы.
Тут верх асіны круглалісты
Сплетаўся з хвоямі, з дубамі,
А ёлкі хмурнымі крыжамі
Высока ў небі выдзялялісь
І сумна з хвоямі шэпталісь.
Заўсёды смутные, як ўдовы,
Яны найбольш адны стаялі,
І так маркотна пазіралі
Іх задуменные галовы.
Лес наступаў і разступаўся,
Лужком зялёным разрываўся,
А дзе прыгожые загібы

Так міла шлі каля сялібы
Што проста-б імі любаваюся.
Ў нізе кустоўнік разсцілаўся,
Ды густа з лесам ён сплетаўся.
Глядзіш, бывала, і здаецца,
Што скрозь галін сьцяну жывую,
Скрозь гэту тканку маладую,
Ні мыш, ні пташка не прабьецца.
Цекла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка,
Абодвы берэгі каторай
Лазьняк, алешнік абступалі,
А ў іх цяньку бруілісь хвалі
І ў луг чуць значнаю разорай
Спакойна так йшлі між чаротоў,
Рабілі многа заваротоў,
Аж покі ў Нёман не ўцекалі.
Зялёны луг, як скінуць вокам,
Абрусам пышным і шырокім
Ад хаты зараз пачынаўся
І ў шыр і ў доўж ён разсцілаўся
Ды йшоў квяцістай раўніною
З высокай мяккаю травою
І зьяў на сонцы ў пералівах
Прыгожых красак. Як на нівах
Жыта збажынка лёгка гнецца
І людзям радасна сьмяецца
Сваім прыятным дзіўным сьпевам
Пад лёгкім ветрыка павевам,
Так гнуцца, гойдаюцца травы,
Як пройме ветрык іх ласкавы,
І пройдуцьградкі травяные
С прыятным пахам чэрадою;
Зашэпчуць краскі між сабою,
Як бы дзеўчаткі маладые,
Эх, луг шырокі! Як жывы, ты,

Лучамі сонейка заліты,
Стаіш ў мяне перэд вачыма.
Ты міл і смуцен, як радзіма,
Як наша ціхая старонка,
Дзе смагі сіньняя плянка
Ў паўднёвы час дымком звісае
І даль задумай спавівае.
Хоць я няволей цяжка змучэн
І з родным берэгам разлучэн,
Але душой я ажываю,
Як вокэм мысьлі азіраю
Цябе, мой луг і берэг родны,
Дзе льецца Нёман срэбраводны,
Дзе дубы дружнай чэрадою
Стаяць магуча над вадою
Даўнейшых спраў вартаўнікамі
І зьяюць грозна джэрэламі.
І толькі тут, пад іх чародкай,
У пятроўкі, добраю пагодкай,
Касьбой утомленны, спачынеш
І думкі клопату пакінеш,
Заснуўшы крэпка і салодка.
Тут так цяніста і прывольна!
А пташкі галасна і здольна
Шчабечуць ў кусьціках, сьпеваюць,
Сваіх, знаць, дзетак забаўляюць.
А на дубох, як шапкі тые,
Чарнеюць гнёзды бусленые,
Буслы клякочуць; бусляняты
Пішчаць жалобна як шчэняты,
Насы высока закідаюць
І с піскам естачкі чэкаюць—
Ў другіх гнездах, дзе маладые
Буслы ўжо трохі акрыяюць,
Яны ўжо крыльля распраўляюць
І сілу пробуюць. Другіе,

Ешчэ дужэйшые, ўзлетаюць
На колькі локцеў над гнездамі
І неуклюдными нагамі
Незграбна оздух загрэбаюць.
А у падсуседзях з бусламі
Тут верабьі, шпакі вядуцца,
Клапотна шчэбет, песьні льюцца
І моўкнуць позна вечэрамі.
Ў дубох крычаць сівоваронкі,
І свіст над лугам рэзкі, звонкі,
Каршун маркотна так раняе
І смутак ў душу закідае...
Эх, луг шырокі! Як жывы ты,
Травой мурожнаю закрыты,
Стаіш, зялёны, прэдамною
І зьяеш сумнаю красою!
Як дзьве старэнькіе кабеткі,
К каторым старасць ў неўзаметкі
Падкраўшысь злодзеем срэдзь ночы,
Як смачны сон змыкае вочы.
Красу і крэпасць забірае
І ўсю іх жывасць выкрадае
Ды кіне іх адных, старэнькіх,
Адных, як пёрст і чуць жывенькіх
І непатрэбных ўжо нікому
На цягасць жыцьцю маладому,—
Так каля хаты у садочку,
Схіліўшысь ціхенька ў куточку,
Стаялі вербы дзьве старые.
А навакола маладые
Дзярэўцы пышна разрасталісь
І згодна з ветрыкам шэпталісь.
Гальлё спусьціўшы над парканам,
Расла тут грушка с тонкім станам,
А ўдоўж паркана пышным валам
Стаяў вішняк густы прыўдалы.

Садок быў, праўда, не вялічкі:
Дзьве вербіны, ды тры дзічкі
Ды між верб ліпка зеленая,
Як бы іх ўнучка маладая...
На прыгуменні, поруч з садам,
Павець з гумном стаяла радам,
А пад паветкай ўсе прылады:
Вазок, калёсы, панарады,
Старые сані, восі колы
І вульлёў некалькі на пчолы,
Ешчэ ня скончэных; судзінка,
Стары цабэрак, поўвасьмінка
І розны хлам і лом валяўся,
Ад сонца, дожджыка хаваўся,—
Патрэбны рэчы, ёсць вядома.
Гуменцэ, крытае саломай.
Ад доўгіх часоў пасівело
Салома кудламі вісела;
Яе вятры тут паздзіралі,
А трохі хлопцы пасьцягалі,
На стрэху лазячы, бывала, –
Забава гэта іх займала.
А пад шчытом на павуціні
Ржаны калосік-сіроціна
Ў зацішку лёганька гайдаўся;
З якіх ён часоў там трымаўся,
То Бог яго Сьвяты ўжо знае.
Будоўля, горш ешчэ старая,
З гнілой вагнутаю страхою,
Стаяў хлявец, як раз напроці
І чуць лепеў, як бы на плоці
Гаршчок разбіты качаргою.
Стары, паточэны чэрвямі,
На бок пахілены ветрамі,
Глядзеў хлеў гэты старычынай,
Пахілай долей жэбрачынай.

А з боку, ў полі, нідалёка
Стаяў прыгрэбнік адзінока,
Пахілкам, горкім сіратою,
Ў зямлю упёршыся страхою.
глыбі двара стаяла хата
І выглядала зухавата
Паміж запушчэнай будовы,
Як бы шляхцянка засцянкова,
Што ў дзень сьвяты каля касьцёла,
Чуць чуць падняўшы край падола,
Так важна ходзіць с парасонам,
Спадніцай верціць, як ветргонам,
З дарожэк пыл, пясок зганяе
І хлопцам ў вочы зазірае.
За хатай поле пачыналось,
Дзе жыто хорашэ гайдалось,
І рос авёс, ячмень і грэчка .
Было прытульнае гняздзечка!
Мой родны кут, лугі, крыніца!
Цяпер для вас я чужаніца. .
Той самы лес, загоны тые,
Ды людзі там жывуць чужые...
Мне душу смутак напаўняе,
Што ў прошласць канулі гадочкі,
Мае шчасьлівые дзянёчкі,—
Прайшла, весна ты залатая!

**Якуб Колас.**

22/VI–3/VII—1911 г.
Мінскі астрог.

# Гэркулес і селянін.

*(Даўнейшая грэцкая казка).*

Селянін ugраз з возам у балоці. Як ня біў ён свайго каня, як не катаваў яго, але воз ні з мейсца!

Што тут рабіць?!

У вялікай турботі, звярнуўся ён з малітвай да Гэркулеса:

— Божухна мой, моцны Гэркулесе! Ты дужы і табе лёгка выратаваць мяне. Памажы, злітуйся!..

І пачуўся голас с хмары:

— Я памагу табе, бедачэ, толькі ты павінен слухаць мяне.

— Кажы, Божухна, слухаю!

— Перш-на-перш вось што: ачысьці гразь с кол... Цяпер — выймі рэмень с пад кол, засып і зараўнуй каўдобіны.

Селянін зрабіў усё, што загадаў Гэркулес.

— А цяпер і я табе памагу,—сказаў Гэркулес: бяры лейцы у рукі ды гукні на каня.

Селянін падняў лейцы, гукнуў і—не агледзіўся, як конь лёгка і ёмка вывез воз з гразі.

— Дык вот-жэ дзякуй!—гукнуў у неба селянін.

— Дык вот-жэ дурэнь!—атказаў яму Гэркулес.

**Я. Лёсік.**

# Лета.

У летні час як весела на полі!...
Пасевамі красуецца земля...
І хочэ жыць і хочэ шчасьця, волі
Душа мая.
Праменем радасным бліскочэ ў небі сонцэ,
Увакруг краса, прывольле, сьветлы рай...
І пекны ж ты, люблю цябе бяз конца,
Мой родны край!
Зялёны гай зьвініць ад птушэк сьпеву,
Гамоняць радасна паміж сабой кусты,
На поплаві, глядзіш, на права і на лева
Кругом кветы.
У хвалях возера разліта пазалота
І радасць шчасная ў бары глухім шуміць
І ручаёк, і рэчка, і балота
Жыцьцём кіпіць.
І думка поўная вясёлай, новай веры...
Эх, дзіўны лета час! Любуюся табой!
Як ты-ж мне міл.. Люблю цябе бяз меры,
Край родны мой!

**Ф. Чэрнышэвіч.**

* * *

Не хачу я нічога казаці табе,
Бо баюся што ў словах маіх
Вылiецца каханьне маё для цябе,
Што усё зразумееш ты з іх.

Не хачу я глядзець, каб з маіх ты вачэй
Тайны сэрца майго не згадаў,
Каб паблеск іх таёмных, гарачых лучэй
Як цябе я люблю не сказаў.

Я каханьне маё пахаваю ў душы,
Спакой сфінкса на твар налажу,
І хоць сэрцэ ад болю сканае ў грудзях,
Я нічога табе не скажу.

А калісь, як на вечны спачын адыйду,
І земля як пакрые мяне,
Ніхай вецер з магілы маей паляціць
І слоў колькі табе пашапне.

Хай зязюля вясной кукаваньнем ў гаю
Аб любві табе скажэ маей,
Хай гавораць аб ей кветкі пахам з лугоў
І пеяньнем сваім салавей.

**К. Буйло.**

# У летні вечэр.

Люблю я вечэрняй парою
Ў суседню дуброву хадзіць,
Люблю я с чароўнай імглою
Журботные думкі дзяліць.
Патроху знікаюць там болі,
Душа там стаецца мацней;
І думка аб людзкай нядолі
Час нейкі ня цісьне грудзей.
Прасьветлые мары ўзвевае,
Крыніца нясе свой плюскот;
На плюскаты вецер зважае—
Ледзь ледзь скалыхае чарот.
Схіліўшысь над рэчкай бурлівай,
Сьцягі там вярбінак стаяць;
Іх лісьця ў трывозі шумлівай
Усё с хваляй аб чымсь гаманяць.
Мне чуецца шопат прыветны
Між гэтых зялёных галін.
Знікае тут змрок безпрасьветны;
Мне лёгка, хоць я і адзін.

**Я. Журба.**

# Сон Анупрэя.

Лёгка зрабілося на сэрцы старому рыбаку Анупрэю, бо ён ухітрыўся цішком ад жонкі перапіць на гарэлку колькі залатовак, ды пераліць у глотку гэтак шпарка, ажно галава ходырам пашла. Дзеля гэтаго ён сьмялей, як заўсёды атправіўся на нач на балота паставіць венцеры на шчасьце. Праўда зыбаўся ён у чоўне ад выпіўкі, як тонкая бярэзіна ад ветру, але нічагусенькі: уладзіў ён ўсё як мае быць і вылез на берэг.

На высокім пагурку, каля пня перэвярнуў ён свой човен, разлажыў вялікае огнішчэ са старых карчоў, накрыўся кажухом і лёг.

Ня чуў ён, як у блізкай пасецы завылі маладые ваўчаты, як зашэптаў жудасны бор над сумнай, адзінокай пусткай, не бачыў, як кругом яго, бытцым запаленые серчыкі поўзалі купальскіе чэрвячкі: ён храпеў на ўсе заставкі.

Сон падобен да сьмерці, але Анупрэю толькі сьнілося, што ён памёр. Адпеялі яго. Жонка галасіла, як мае быць, хаўтуры уладзіла па людзку, не паскупіла ні выпіўкі, ні закускі. Пахавалі яго бытцым пана якога у глыбокую яму, засыпалі пяском і—квіта, пане Мікіта!..

Не пасьпелі ешчэ людзі і з могілак зыйсьці, як прыляцелі крылатые, белые анёлы, пад-

хапілі яго, як лёгкую саломінку і панесьлі на суд да самаго Бога.

Бачыць ён—Бог сядзіць на высокім пасадзе пры ім стаяць усе сьвятые, а кругом на цыпачках ходзяць пісары і падпіскі, якраз, як у воласьці.

— Вось ён!—сказалі анёлы і падвялі Анупрэя бліжэй да Бога. Ажно лапаткі у Анупрэя задрыжэлі, як калісь то перад земскім. Жартачкі!

—Прачытайце мне, што ён за чэлавек?—сказаў Бог.

Ходырам пайшла ўся каманда пісарчукоў рыцца па шафах і столох; рылі, рылі і знайшлі.. —Есць! І адзін спрытны грэмзака падаў паважнаму, сурьёзнаму сэкрэтару тонкі сшытак. Спужаўся Анупрэй, думаў ён, што вось, на безгалоўе, падаткі у яго будуць спаганяць, бо якраз гэткіе паперыны, бывала, ўураднік валок с сабой, як за падаткамі прыежджаў, але барджэй усхапіўся, што эта-ж ён ужо нябошчык і супакоіўся..

— Чытай! - загадаў Бог.

І пачаў пісар чытаць з самаго пачатку, як калісь то Анупрэй быў ешчэ пастушком у благога гаспадара, як гаспадар яму косьці цёр..

Слухаў, слухаў Анупрэй і дзіву даўся:— Спанатрыў такі ўсё! Хацеў ён сказаць, але ў час стрымаўся.

Ціха было у небі, усе прыслухаліся, як пісар чытаў:

—... І быў Анупрэй заўсёды спакойны, паслухняны, не к аў, не сварыўся. Усе яго крыўдзілі, а ён маўчаў... Чужы хлапец краў яблыкі с панскаго саду—лупцэвалі Анупрэя..

Самые цяжкіе работы загадывалі рабіць Ануп-рэю... Анупрэю на палудзень хлеба не давалі, Анупрэй вячэру прапусьціў, Анупрэй маўчаў, калі яму балело. Не пажаліўся ён і тады, як хатка яго згарэла... Ніхто ня ведаў калі яго сямейка душылася посным шчаўём, бяз хлеба.. У каго каня укралі - у Анупрэя. У каго кароўка здохла—у Анупрэя. У каго воўк авечэк пабіў—у Анупрэя. Каго ў воласць на работу выправілі—Анупрэя. Дрэнна жылося яму, а ён нават баяўся самому Богу пажаліцца на гаротнае жыцьцё сваё... баяўся, бо благіе людзі надта напужалі яго... баяўся, бо усе з яго сьмеяліся і ён думаў, што і ў Бога ён горшы за ўсіх...—Не плакаў ніколі: я горшы за ўсіх—думаў ён... Таптালі твар яго гразнымі ботамі, зьдзекаваліся над ім... Часам кроў з вачэй лілася, сарцэ было ранена, твар скрыўлены быў ад страшэннай болі, а ён маўчаў, бо што-ж,—думаў ён сабе,—ці я маю вартнасць якую, каб мяне шанавалі?... І да апошняй мінуты ён аб сваей крыўдзе нікому слаўца не сказаў, і гэтак Богу душу аддаў...

Змоўк пісар.

—... Сынок мой! прашэптаў Бог і шэпт той чуцен быў з аднаго канца сьвету да другога канца і добрые вочы Божые напоўніліся сьлезамі.

— Сынок!.. прагаварыў Ён гэтак жаласна, што нават сам Анупрэй, чуць не заплакаў з жалю...

Усе сьвятые плакалі, а пісары і пісарчукі тые, то ужо даўно у рукавы сморкаліся.

І лёгка зрабілося Анупрэю на душы, нават лягчэй чым тады, калі ён раз да сыта абаранкоў наеўся..

— Першае мейсцо паміж сьвятых займаеш, Анупрэй!..—сказаў Бог.

— Скажы, Анупрэйка, чаго ешчэ хочэш, дамо!

Анупрэй толькі патыліцу чухаў. Неяк ён усё сваё жыцьцё маўчаў, ажно язык яго зрабіўся бытцым пяціпудовая вага...

— Кажы, кажы! Ня бойся!—казаў Бог.

— Дзякую, Божухна, за ўсё!—асьмеліўся атказаць Анупрэй, але калі ўжо гэтак, дык загадай Сорцы, каб яна кожну раніцу давала мне чарку гарэлкі і селядзец!...

Апусьціў галаву Бог. Спахмурнелі сьвятые.

— Ці ты здурнеў?...

— Ці ты ачмуцеў?..

Шэпталі яму пісары і падпіскі. А чэрці ў пеклі, пад іސподам, страшэнна рагаталі...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Прачнуўся Анупрэй с пераляку с туманам у мазгах ад учэрашняй выпіўкі. Вогнішчэ даўпо пагасло. Над высокай соснай закаркалі вароны і недзе далёка у вёсцы забрэхалі сабакі.

Анупрэй пацягнуўся раз, другі і, ўстаўшы, спіхнуў човен у ваду і паехаў вытрэсаць венцеры.

**Змітрок Бядуля.**

# Пяць лыжэк зацiркi.

— Агата! Агата!!

— Ну, чаго глотку дзярэш?

— Скора зацiрка згатуецца?

— Маеш часу пачэкаць трохi, не панясу прадаваць на кiрмаш, пасьпееш насёрбацца!

Ешчэ ня ўсьпела яна атказаць свайму Антасю, каторы ляжаў на пяколку i стагнаў нi то ад болi, нi то ад голаду, як з усiх бакоў апанавалi яе дзеткi, нет ведама хлопчыкi цi дзяўчынкi, бо яны былi адзеты усе у доўгiе да пят кашулькi.. Запiшчэлi яны ўсе у адзiн голас:

— Мамка зацiльку гатуець!

— Мамка зацiльку гатуець!

I давай скакаць кругом мацi i шчыпаць за хвартух i спадніцу, як галодные ваўчаты.

— Мамка мне дасi!

— Мамка мне дасi!

I блiшчэлi iх галодные вочы ад радасьцi...

—Цi-i-iха каб вы падохлi!—крыкнула Агата, —згатаваць не даюць, хоць ты тут на кавалкi разсыпайся!—i адагнала iх вiлачнiкам ад прыпечка...

Гэта было вясной, як раз у тую пару, калi самая страшэнная галацьба пануе у бедных вёсках, калi нiма чым i муху накармiць. Апошнi запас вышоў, хоць зубамi ляпай—шчаўя ешчэ нiмашэка... Нi дай Бог, якое цяпер жыцьцё у гэткаго гаспадара, як у хвораго Антошы, каторы сам рабiць ня можэ, а толькi жонка адна працуець на яго i дзяцей.

Але учора Бог ей шчасьце даў—яна неяк выенчыла у блізкай пані з фунт мукі на зацірку.

Вось і гатуець яна для сваей сямейкі гэтае панскае сьнеданьне... У цёмнай, малой хатцы пануець сьвята нейкае...

Пазіраў усё Антон на прыпечэк і ціха бурчэў, бо ён ведаў, што цяпер то Агата валадарніца... Пазіралі дзеткі с-пад цёмнаго тапчана на вясёлы агоньчык у печы і шушукаліся.

Агата усё падлівала вады і мешала зацірку вялікай лыжкай, мешала, мешала і паставіла на стол.

— Гатова!—крыкнуў Антось, бытцым пьяны, і давай карабкацца с пяколка.

— Гатова! гатова!—запішчэлі дзеткі і пусьціліся як зайчыкі да стала, дзе ужо стаяла вялікая паліўная міска, у каторую Агата перэліла зацірку з гаршчка. Толькі густы пахучы пар круціўся над міскай і умацовываў галодны апэтыт шчасьлівай у гэты момэнт сямьі.

* * *

Шчасьце ня маець сваей асобнай меркі для ўсіх людзей на сьвеці, але кожын чэлавек маець сваю асобную мерку да шчасьця і свой асобны погляд на самае шчасьце...

* * *

І шчасьлівая сямейка хваталася за лыжкі.

Сёрб! сёрб! і—„ай! ай! ай!“ запішчэлі дзеткі. Антось маўчаў, толкі вылупіў вочы, бытцым канаць сабраўся.

— А каб вы падохлі, я-ж вам казала, не хапайце, бо гарачая!—лаяла іх Агата.

Пазіралі, пазіралі яны на гарачую зацірку і ня вытрывалі—ізноў давай сёрбаць... Толькі сьлёзы каціліся у іх ад шчыраго сёрбаньня. Ня з'елі яны ешчэ і трэйцяй часткі як накруцілася суседка Сьцёпчыха.

— Дзень добры!

— Дзень добры!

— Хлеб ды соль!

— Дзе тут хлеб—зацірку сёрбаем, просім на сьнеданьне!—кажэ Агата.

— Ого! на зацірку і я ахвотніца!—адказала Сьцёпчыха, пазіраючы маркотнымі галоднымі вачыма. Узяла лыжку і спрытна падсела да міскі...

Сьпахмурнеў Антось і толькі ніжэй апусьціў галаву да міскі са злосьці.

— Во, і нам самім мала,—падумаў ён.

Зьела адну лыжку і давай сёрбаць другую.—

— Ой, каб цябе паляруш!—чуць не зла-яў Антось, але стрымаўся, толькі давай старацца! Дзеткі так сама пачулі небэспеку і скоса пазіраючы на Сьцёпчыху спрытна запрацавалі лыжкамі...

— Тры!—чуць ня крыкнуў Антось, як Сьцёпчыха сёрбала ужо трэйцюю лыжку.

— Ратуйце! Ратуйце!—здаецца плакаў-бы ён, як яна узялася за чацьвёртую лыжку. А як зьела пятую, то ужо міска была пустая...

— Ой, разбойніца!—крыкнуў Антось на сваю Агатку, як ужо Сьцёпчыха падзякавала і пашла—каб ты прапала з ей разам!..

— Ці я вінавата, што яна гэткая сьвіньня!..—чуць не плакала Агата.

І папсулася сьвята у беднай сямейцы, спахмурнелі твары.

Кожын думаў. - Ого! каб гэта лепей я зьеў гэтых пяць лыжэк заціркі...

* *
*

Нешчасьце ня маець сваей асобнай меркі для ўсіх людзей на сьвеці, але кожын чэлавек маець сваю асобную мерку да нешчасьця і свой асобны погляд на самае нешчасьце.

**Зьмітрок Бядуля.**

## Тры зладзеі.

І цяпер і бывала ёсць здарэньнёў ні мала,
Як ні мала на сьвеці народу;
Я йшчэ помню,—ці чулі?—як нам правіў дзядуля
Адну дзіўну і сьмешну прыгоду.
— Дзеткі,—так ён гаворэ,—ў вадным мейсцы, за морэм,
У Нямеччыне, за часоў даўных,
Гдзе край мудры, багаты, і народ панаваты,
Трох зладзеёў было вельмі слаўных.
Вось, адною пароюю мелі раду з сабою,
Куды кінуцца ім на здабычу?
Адзін кажэ: „да вёскі", другі кажэ: „да Моські",
Старшы кажэ: „да пана я жычу".
А яму гаворaць тые: „там сабакі ліхіе,
„І замкі вельмі крэпкі да тога,
„Ды жалезны аковы, мур высокі і новы,
„І дворні, як на ліха, там многа".
—„Э, німа што баяцца, толькі трэба узяцца,
„А ўжо добрые будзем мець гулі!"
І, падкраўшыся ракам, сыпнуў зельля сабакам;
Тые зразу, як відзіш, паснулі.
І, зайшоўшы ад саду, дастаў нейку прыладу
Ды вакно з рамкай выняў бяз мукі,
Сам палез у пакоі, стаў збіраць сёе-тое,
Што папала на-скора пад рукі.
Ён там доўга стараўся і да скарбца дабраўся,
Што быў туга, як кіем, набіты;
Ў ім лежало бяз конца і рублёў і чырвонцаў,
На дне пояс із золата літы.
Там яны да астатка, ўсё абчысьціўшы гладка—

Усе чыста куточкі і шпаркі,
Выйшлі, ўсё пазбіралі ды дзяліціся сталі
Між сабою бяз крыўды, бяз сваркі.
І узялі так класьці на тры роўные часьці,
Але пояс быў вельмі прыгодзен;
За яго сталі брацца, пачалі тут спрэчацца,
А ўступіць то ня хочэ ніводзін:
Старшы кажэ: „паждзжыце, калатні не рабіце,
„Бо дабра с таго пэўне ня будзе;
„Як німашака згоды, пойдзем да ваеводы:
„Ён нас хіба найлепей разсудзе“.
Але ведаць ня шкодзе, што таму ваеводзе,
Дзе згарнулі багацьце ні мала,
С чэрады быць судзьдзёю над таей старанoю
Акурат пад той час выпадала.
І судзьдзя той такую меў налогу брыдкую:
Любіў вельмі ён казкі; бывала,
Зіму, восень і лета трымаў хлопца на гэта,
І той баяў яму, што папала.
Спаць—здаровы, ці хворы—мусіў ў панскай
каморы
У кутку пры дзверах на памосьці;
Пан, як толькі прачнецца, на хлапца адазвецца,
Каб ён баяў харошаго штосьці.
Во-таж злодзей той старшы, пад вакном ціха
стаўшы,
Абодвым сказаў пільна паслухаць,
Сам палез да пакою, лёг за хлопца сьпіною
Таму зельля пад нос даў панюхаць;
А тады на трывогу нагой грукнуў ў падлогу
Ды захроп на ўсю панску каморку.
Пан, як відзіш, прачнуўся, на хлапца навярнуўся:
„Кажы казку, ты шэльма!“—гаворэ.
Той, змяніўшы размову, пачаў казку такову:
„За гарамі, далёка на сьвеці

„Было некаліСь сталых трох зладзеёў удалых,
„Двох малодшых, старэйшы быў трэці.
„Яны ў ночку туманну, к аднаму прыйшлі
пану
„(Дазналіся, што грошэй меў многа).
„Старшы знаў загаворы, дык палез да каморы
„Сну на дворню навёўшы цяжкога.
„Ён там лазіў і гнуўся, ажно ў скарбцы спы-
нуўся,
„Хоць той вельмі дарэчна быў схован;
„Там на самым вяршочку, як і ў нас, мой па-
ночку,
„Лежаў пояс з золата кован
„Злодзей гэны ўсё з дому падаваў быў дру-
гому,
„А ўжо трэйці адносіў йшчэ далей,
„І вось гэткім парадкам вельмі спраўна і
гладка
„Таго пана на чыста абкралі.
„Па рабоці той сьмелай, як прышло да раз-
дзелу,
„Выйшла ў іх калатня не малая:
„Раздзяліўшы ўсё гладка, за паяс выйшла
звадка,—
„Яго кожын сабе забірае.
„Як здаецца паночку, (—ды сыпнуў з мя-
шочка),
„Каму пояс павінен дастацца?“
А пан ціха і скора ужо сонны гаворэ:
„Во! старшому!—німа што пытацца!“—
Як той вылез ад туль, „а што?—кажэ—ці чулі,
Што сказаў нам сам пан ваевода?“
Дык на тым асталося, што каму давялося,
І настала ізноў у іх згода.
Як дачуліся недзе ваеводы суседзі,—
Лезуць ў вочы і роўны, няроўны:

Людзі, к жартам ахвочы, кпяць, сьмяюцца за
вочы,
А найгорэй мейсцовы духоўны,
Дык таму ваеводзі стала слухаць ўжо годзе:
Ен пусьціў пагалоску такую,
Каб старэйшы той злодзей к яму сьмела пры-
ходзіў,
Бо яму пан усё падаруе.
Неяк раз адвячоркам—серадой, ці аўторкам—
Як здаецца, васеньняй парою—
Здаравенны мужчына, ростам зо тры аршыны
Паявіўся у панскім парозі.
Пан зразу спужаўся, ды ў таго запытаўся:
„Ты ад куль тут узяўся, як з ямы?
„Мо ты пояс сплавіў, ды йшчэ казку тут пра-
віў?“
—„Гэта я, мой паночку, той самы“.
—„Вось табея мой братка, выбачаю на гладка,
„Можэш нават барыша спадзевацца,
Калі зробіш ты штуку духоўнаму ў навуку,
Каб я мог ды над ім пасьмеяцца!“—
—„Добра!—гэны гаворэ,—адсьмяешся і скора,
„Абы толькі хватало ахвоты“...
І, пазваўшы дружакоў, злавіў дзьве торбы ра-
коў
Ды забраўся да мудрай работы.
Пайшлі ў поўнач глухую у бажніцу у тую,
Што стаяла на краі ў аддалі,
Усім ракам на плечы наляпілі па сьвечы,
Запаліўшы іх, поўзаць пускалі.
Ды прыбраўшыся самі ў двох паслухачамі,
сё сьвятло запаліўшы на кепства,
Старшы ўздзеў дзеля віду духоўную хламіду,
Пачалі разам правіць малебства.
Сторож калі прачнецца,—сам незнае, гдзе
дзецца!

Кінуў вокам праз шчыліну ўсюды
І са страхам, с трывогай пёр да дому дарогай,
Ледзь прамовіў ён: „дзівы ў нас, цуды!“
Пастор наш працёр вочы: „што за ліха па
ночы?
„Вар'яцеў чэлавек мо часамі?“ –
Той склаў рукі на грудзі: „там анёлы, ня людзі,
„У бажніцы ў нас моляцца самі!“
Дык і ён прыпёр скора, „fater unser“ гаворэ,
На зямлю упаўшы ніц тварам,
І сьлязінку уроне, ажно гэны гамоне
Да яго, што стаяў прад аўтарам:
„Браце,– кажэ,—мой мілы, з Боскай моцы і
сілы
„Табе ведаць сягоньня патрэба
„На сам перад вось тое, за жыцьцё за сьвя-
тое
„З душой, с целам ты пойдзеш да неба;
„Толькі помні, мой браце, што тваё ўсё ба-
гацьце
„Для убогіх павінно астацца,
„То-ж праз месяц ты здому, нісказаўшы нікому
„У дарогу павінен сабрацца“.—
І сьвятло пагасіўшы, ды ракоў палавіўшы,
Пайшлі сьмеючыся да дому;
А наш пастар, што мае, усё скора збывае
І ні кажэ нічога нікому.
А тут, з ветрам бы хмарка, праляцеў месяц
шпарка
І пара ўжо збірацца ў дарогу;
Ў вадну ночку пануру, пад грымоты і буру
Далі знаць у Бажніцы трывогу.
А духоўніка ў неба будзіць доўга ня трэба:
Ен лічыў сябе госьцем у дому,
Дык, як бачыш, прыходзе і так сама знахо-
дзіць

Тое ўсё, што было месяц тому.
Яму госць на пачатку кажэ: во-таж, мой братка,
„Я ад Бога сягоньня прысланы.
„І то ведаць патрэба каб дастацца да неба,
„Трэба лезьці у мех у скураны“.
І духоўнік наш бачэ, як у двох паслухачы
Падстаўляюць вялізны мех—с пуню!
Ён ня пэвен, што будзе, склаўшы рукі на грудзі
Сваю бедну галоўку ўжо суне.
Тые, доўга не ждаўшы, крэпка мех завязаўшы
Пацягнулі яго ад парога;
Толькі з меха стагнала як яго падкідало,
Пакуль скончылась ў неба дарога.
Аж шурчэлі каменьня, як цягнулі з сяленьня
На гару, дзе вісельня стаяла;
Там вяроўкай мех скора падцягнулі у гору,
І пайшлі, як ні ў чым не бывала.
А назаўтра на ранку ваевода з нагайкай
І гасьцей напрасіўшы сабраньне,
Ды, усей грамадаю акурат ў мейсцэ тое
Ехаці здумаў на паляваньне.
Бытцым ў рэчы ні знае, ды у голас пытае;
„А тут што? ешчэ чаго не бывала!“
І, рубнуўшы палашам,—„я це—кажэ—пастра-
шу!“
Мех упаў, аж земля застагнала.
А тут служкі прыпалі, ды мяшок развязалі,—
Адтуль пастар вылазе паволі...
Ваевода-ж пацеху меў вяліку і сьмеху,
Жартаваў з бедака ён даволі.
І расказываць годзе што найлепш выйшоў
злодзей,
(Стары баяў)—вось, помніце, дзеці,
Як двох роўных збяруцца, ды калі задзяруцца,
Карыстае заўсёды там трэйці.

**Стары Ўлас.**

# Родные зьявы

## Ў СТАРЫХ ДУБО́Х.

### I.

Цэлы гай старасьвецкіх дубоў раскінуўся па берэзі Нёмана.

Такіх дубоў цяпер рэдка дзе убачыш. Іх не чапіла рука людзкая, толькі доўгіе часы палажылі на іх свой сьлед печаць глыбокай старасьці. І многа ўсякіх зьмен часаў бачылі гэтые нямые сьведкі прошласьці! Жыцьцё многіх людзкіх пакаленьнёў прайшло перад імі і праходзіць, бы тые хвалі Нёмна, што пакручастым зьмеем абвівае тут іх сялібу, іх высокі, роўны груд; а яны ўсё стаяць, спакойные, важные, і жывуць сваім асобным жыцьцём. Праходзяць дні, ідуць сваёю чэрадою зімы і леты з іх халадамі і сьпякотамі, з іх бурамі і навальніцамі, а яны спакойны, як чэлавек, каторы усё пераведаў на сьвеці, ўсё перажыў і ужо нічога новаго не чэкае ад жыцьця, апроч сьмерці. Зваленые жэ на дол тоўстые камлі з асмаленымі знізу жэрэламі іх таварышоў напаміналі жывым аб апошняй іх долі.

Ў леці пачыналася ужо тая чуць значная зьмена, той паварот часу, калі жыцьцё прыроды ідзе на убытак Скошэны луг і раскіданые курганамі стагі, парыжэўшые ад даждж оў і сонца, ужо гаварылі аб гэтым уміраньні. Буслы зьбіраліся у чароды і доўга стаялі па грудах,

або ляніва аглядалі лагчыны. Але было заметна, што не на пажытак пазбіраліся яны сюды, а для якойсь то другой справы. Пастаяўшы. павольна, адзін за другім, уздымаліся яны у гару, кружыліся там, і кожны круг падыймаў іх ўсё вышэй і вышей. Там яны сплеталіся у адну фігуру, ў адзін шырокі круг і, не махаючы крыльлямі, плаўна і сагласна, як па камандзе, насіліся ў неаглядным прасторы сініх небясоў.. Асірацелые старые дубы у чорных шапках бусляных гнёздаў спакойна стаялі, не варушачы ніводным лістом, і купалі на сонцы свае адвечные лапы. На скошэным лузе, нідалёка ад дубоў, пасьвіліся стадкі. Там і сям сядзелі пастушкі. У кожнай іх кучы былі свае інтэрэсы, свае забаўкі і гутаркі. Сонцэ даўно ўжо звярнуло с поўдня, але сьвяціло ешчэ горача. У воздусі было ціха, толькі звон летнікоў (кузуркі, падобные да пчол) зліваўся ў адну доўгую-доўгую аднатонную песьню, і здавалося. прырода была закалыхана гэтым крыху сумным звонам. Маленькіе камарыкі— таўкунчыкі кучкамі гулялі на сонцы, як бы чыясь-то нявідная рука трасла у воздусі маленькую сетачку.

— Чаго яны таўкуцца тут?—спытаў Грышка свайго таварыша Базыля і махнуў рукою па кучцы камарыкоў.

— Гуляюць,—кажэ Базыль:—ты думаеш і ім ня хочэцца пагуляць? Цяпер іх час і гуляюць.

Базыль і грышка найлепшые дружакі. Даўно ужо цягнецца іх дружба— як запамятаюць. Дзьве зімы у школцы сядзелі яны на аднэй лаўцы і трэйцяе лето пасуць разам кароўкі. Калі катораму маці дасць у торбачку

сала, то гэтае сало разрэзвалі папалові і пяклі яго на ражончыках. А смачнае сало, спечанае над агнём у полі! Прыгнаўшы з раніцы, хадзілі разм лавіць рыбу і купаца. І ніскім яны не злучаліся і. апроч сваей кампаніі, другой не хацелі. Раз толькі сварыліся хлопцы і пасварыліся за глупства—за ножык-цыганчык, катораму уся цэна тры грошы. І толькі у злосьці назваў Грышка Базыля Насалём—у Базыля быў доўгаваты нос,—а Базыль Грышку абазваў Рабэйзаю. Але рэдкіе здарэньня лаянкі толькі на кароткі час раскідалі іх дружбу, і хлопцы скора зноў гадзіліся, посьле чаго Базыль, водзячы пальцамі па носі, гаварыў:

— Здаецца, мой нос, Грышка, не такі ўжо вялікі?

— Ды не!—заспакоіваў яго Грышка:—твой нос—мерны нос. Вось я, дык праўда рабы!—гаворачы так, Грышка хацеў учуць падцьвярджэньне Базыля, што ён не так-то рабы, бо сам Грышка не лічыў сябе рабым.

— Што тваё за рабаценьне!—казаў Базыль:—зімою зусім не знаць, а цяпер проста сонцэ трошкі асмаліло твар.

І хлопцы зноў былі дружкамі і пачыналі гульню або гаворку аб чым-небудзь. Гаворка у іх бадай ніколі ня зводзілася, а вакруг было так многа ўсяго, што давало ім страву для гутарккі.

Улягуцца часамі хлопцы пад дубом; Грышка ляжэ на спіну і колькі мінут моўчкі углядаецца на той дуб, пад каторым лежалі.

— Як ты думаеш, Базыль: ці ёсць на сьвеці такі чэлавек, каторы-б панёс гэты дуб?

Базыль акідаў вокам дуб і, крыху падумаўшы, казаў.

— А пэўне ёсць.

І тут-жэ расказываў свайму сябру здарэньне з якім-небудзь асілкам Так адзін мужык (Базыль нават назваў яго прозвішчэ) паехаў красьці хвою у княжэцкі лес. Ссек ён такую таўстую хвою, што і два чэлавекі не абнялі-б яе. Узваліў на воз і паганяе каня. Конь—ані з мейсца! А якраз насунуўся лясьнік. „Стой жэ думае ён:—ня гдзе ты дзенешся: не ўцячэш ты з гэтай хвоей“, і сам пазірае, што будзе далей. Чэлавек гэты, нічога не гаворачы, выпрог каня, прывязаў яго да канца калоды і, сказаўшы: „ніхай-жэ будзе брыдка каню“, узяўся за аглоблі і пацягнуў калоду! Лясьнік толькі галавою пакруціў—і слова не сказаў мужыку.

— Вось каб мы былі такіе дужые: усіх бы зарэчэнцоў пабілі!—Уздыхнуўшы, гаварыў Грышка.

— Вось дзіва! што-ж іх тады біць? дзьмухнуў бы, і усё-б пакідаліся.

— А ці праўда, што наш Нічыпар Шулай дужаўся с чортам?—Запытаўся зноў Грышка.

— Нёж не: у яго самога чортаво рабро—яго ніхто не пакоціць.—

— Ну, ніхто! а калі у каго два рабры?

— Ведама пабора той, у каго два... Але, мусіць той, хто мае чортаво рабро, пойдзе ў пекла,—памаўчаўшы зноў сказаў Базыль.

— Чаму у пекла? ён жэ родзіцца з гэтым рабром. Калі і пойдзе хто, дык пэўне маці, бо яна с чортам любілася,—сказаў Грышка.

Базыль на гэта нічога не адказаў і задумаўся.

— А каб табе, Базыль, сказалі: „Умірай

цяперака, і ты пойдзеш у рай“. Ці згодзіўся-б ты уміраць.

Базыль памаўчаў.

— Не!—адказаў ён.

— Чаму?—

— Мне было-б там маркотна аднаму; а тут усе: бацькі, хлопцы, ты. Каб са ўсімі, то пашоў-бы.

· І як гэта памрэ чэлавек, што з ім робіцца? · Як бы сябе самога пытаў Грышка.

— Што-ж? душа выходзіць. Прыйдзе сьмерць і памрэш. Зяханеш разоў два і-німа!.. Я бачыў, як уміраў мой дзед Гаронім. У хаці мы былі адны з дзядзькам. Як дзед сканаў, дык дзядзька адчыніў комін.

—· На вошта?—спытаў Грышка.

— Каб душа выходзіла... І страшна, брат, страшна стала! .

— Я-б у хаці ня ўседзіў!—сьтрэпануўшыся, сказаў Грышка і потым дабавіў:

— Вось каб яе пяруны з гэтаю сьмерцью. Каб злавіў дзе, халеру, ды спаліў. Тады людзі жылі-б і жылі.

— Калі-ж бо для яе німа сьмерці.

— У сьмерці німі сьмерці,—сказаўшы гэта, Грышка углыбіўся у думкі.

— Што-ж брат: каб гэту сьмерць узяла другая сьмерць, дык зноў бы сьмерць асталася. Ніяк, брат, ад яе ня выкіруешся

— А што, Г. ышка: калі я памру і па сьмерці буду прыходзіць да цябе, ці будзеш ты баяцца?

— Кіньмо гаварыць! чорт яе бяры з сьмерцьцю,—сказаў Грышка, падняўся, азірнуўся і пачаў сьвістаць, каб адагнаць паганые думкі.

Хлопцы сьціхлі і задумаліся.

Было тут у дубох адно мейсцо, дзе Базыль любіў сядзець, пазіраць і думаць. Гэта было тое мейсцо, дзе над абрывістым берэгам Нёмана стаяў стары, прысадзісты, тоўсты дуб. Ад доўгіх часоў берэг, падмываны вадою павола асова і агаляў тоўстые карэньня старога дуба. Сам гэты дуб крыху пахіліўся на бок, як падгуляўшы гаспадар, а аны і працягнуты над вадою яго корэнь здаваўся нагою, і выходзіло здалёк так, што дуб збіраўся перэбрысьці Нёман. Сеўшы на гэтым корэні, Базыль пазіраў, як беглі дробные хвалі, як звівалася ў вадзе доўгая раса; вада то ўздымала яе, то апускала, то раскідала ва ўсе бакі і гуляла ею, як вецер дымам. Каля самаго берэга стаяў у вадзе голы лазовы ражон. Ён тое і рабіў, што борздзенькаківаўся пад напорам вады. І ніколі ня меў спачыну гэты ражон: і ў дзень і ў ночы ківаўся ён, як багамольны жыд. Хіба можэ зімою, як маразы скуюць лёдам ваду, адпачыне гэты пахілак-ражон. Базыль пазіраў і думаў. А вакруг было ціха. І Базылю здавалося, што ён чуе спевы гэтай цішыны, доўга ён прыслуховаўся, але сьпевы былі нейкіе невясёлые, і яму стала маркотна: ўсё йшло, здавалося яму, сваею дарогаю і жыло сваім жыцьцём, сярод катораго ён пачуў сябе чужым. А Грышка тым часам бегаў па берэзі і зварочываў у ваду навіслы берэг. Як раз на тым баку ішоў з вудамі рыбак.

— Дзядзька!—гукнуў Грышка: —перакінь мне закурыць.—

„Дзядзька“ азірнуў Грышку і сказаў:

— Пакуры, браце, ў сабакі!

— Рыбак—дурак! У рыбака голые бака!

—адказаў яму на гэта Грышка.

— Аа-а! гэта-ж, здаецца, той самы, што пакраў яйца с пад сучкі?—гукнуў с таго берэга рыбак.

Не сьцяміўшы насьмешкі, Грышка не знайшоў нічога сказаць і толькі спытаў:

— С пад якой сучкі?

— Што брэшэ с пад анучкі.

— Каб ты-ж дай Бог нічога не злавіў, каб ты усе вуды папарываў!—

А рыбак рагатаў і начэпліваў на вудачку чэрвяка.

Пабегаўшы па берэзі ешчэ колькі часу, Грышка пашоў шукаць Базыля Углыбіўшыся у свае думкі, Базыль нічога не уважаў і сядзеў усё на тым жэ дубовым карэньні, дзе сядзеў і раней. Звесіўшы ногі над вадою, пазіраў ён ўніз, як цёк Нёман. Тут было глыбока, і вада мела цёмны колер ад гэтай глыбіны. Аб чым жэ думаў хлопчык? Відаць, нешта важнае і сур'ёзнае, бо губы яго былі шчыльна самкнуты, а вочы пазіралі кудысь-то ў глыб. Схаваўшыся за куст, Грышка моўчкі паглядаў за сваім сябрам. І без усякай злой мысьлі раптам выляцеў з за куста і гукнуў на ўсю моц:

— Га-а!

Знячэўку Базыль так перэпалохаўся, што увесь задрыжаў і падскочыў. Спужаўшыся, ён ня мог ужо утрымацца і ссунуўся ўніз. На момэнт, зачапіўшыся лапцем за дубовы корэнь, павіс галавой над гладдзью вады, а потым шугнуў і... прапаў з вачэй. Нёман злёгка здрыгануўся, вада разступілася і дала нешчаснаму хлопчыку мейсцо у мокрых і халодных сваіх недрах ды колькі кругоў пабегла па вадзе ва ўсе бакі. Разы два ці тры паказа-

лася яго галава; рука незграбна і сударажна лавіла воздух, зрабіўшы невялічкі паўкруг, і, захлёбываючыся, прапаў на зусім...

Грышка ня ведаў, што так можэ кончыцца яго дурасць, і ён падняў праразлівы крык і лямант.

— А Божэ ж мой! утапі-і-іўся!

— Гвалт людзі, ратуйце!—

Другіе пастушкі збегліся на гэты крык і прылучылі свой лямант.

Рыбак дабег першы. Скінуўшы адзежу, адважна рынуўся ён у ваду.

Збегліся людзі.

Заламаўшы рукі, маці, разрываючым душу крыкам, галасіла і прычытвала.

Як непрытомная, кідалася яна у ваду, ды яе трымалі мужчыны...

Сонцэ так сама пазірало любоўна і на гэту зьяву; так сама было ціха ў прыродзі і ўсё жыло сваім жыцьцём. Старые дубы стаялі спакойна, важна, як і заўсягды. Толькі галкі, спуджэные людзкім крыкам, пазлетали з дубоў да сівcovаронкі з сярдзітым краканьнем кружыліся над дуплястымі дзерэвякамі, як бы злуючы на тое, што патрывожылі без усякай прычыны іх прывольны пакой, зіялі на сонцы сваім зялёным пер'ем.

---

Базыля выратавалі і адкалыхалі, але, пасьле такога здарэньня, ён утраціў голас і застаўся нямым.

**Тарас Гушча.**

# Вечэр.

Закацілося сонцэ чырвонае
І даліна сьпяшыць пацямнець...
Узыйшлі ў небі зоркі чароўные
Сталі весела, ясна гарэць...

У люстра возера месяц ўгледаецца,
Блескам срэбным ён хвалі абліў,
Каля лесу туман расцілаецца
І ўсё поле сабой ахапіў...

Усё замоўкла... І хочэцца, хочэцца
Ў ласцы ціхаго сна спачываць,—
Сэрцэ бьецца у грудзях і просіцца
Невядомае шчасьце спазнаць!...

**А. Гурло.**

Капыль, 30/V—1912 г.

## Благаслаўленьне вясельнае.

1) Сціхні, ты дудка, сціхні галубка! Каб ты век іграла, а на гэты час перэстала;—такжэ і вы сціхніце жоначкі, белые-галовачкі, чорные аборачкі. Не для вас саміх, а для слуг сваіх і для Госпада Бога і Духа Сьвятога, праз пашану вашу прошламу ускрэсеньню, залатому крэслу, мужскому пасядзэню. Гэта ж не я прашу, а наш князь малады, а ваш зяць родны, каб вы яго паблагаславілі і парачылі за цісовые сталы, за шаўковые абрусы, за вінные чары, за Божые дары, каб сесьць і сьпіць і зьесць і пабяседаваць. Хлеба-солі даць і ўсіх пазваць і ў дуду заіграць.

Прашу-ж гэтаму дзіцяці благаслаўленьне даці анельскім словам і нізкім паклонам.

*Атказ:* Благаслаў Божэ!

2) Такжэ-ж ён просіць сваю родную мамку радзіцельку, наймілейшую карміцельку, каторая яго цяжэнька насіла, і цяжэй таго спарадзіла, цёмные ночкі не дасыпала, с пачопак ножэк не выймала, шэлегавала-палегавала, яснай сьвечкі не пагашала. Прашу-ж гэтаму дзіцяці за матку благаслаўленьне даці анельскім словам і нізкім паклонам

*Атказ:* Благаслаў Божэ!

3) Такжэ-ж рад-бы ён свайго роднаго татку на благаслаўленьне пазваці, ды негдзе-ж яго узяці: с таго сьвету не падняці: грабовые дошкі, сціснулі ножкі, жоўтые пясочкі, засыпалі вочкі, сыра маць-земля к грудцам прылегла, чорная смага на губу успала; рад-бы ён буйны ветры наняці у чыстае поле паслаці, жоўтые пяскі раскапаці, грабовые дошкі разламаці. Не яго-ж то воля, а самаго Госпада Бога і Духа Сьвятога. Прашу-ж гэтаму дзіцяці за татку благаслаўленьне даці анельскім

словам і нізкім паклонам.

*Атказ*: Благаслаў Божэ!

4) Такжэ-ж ён просіць родную бабку каторая пры радох стаяла, с чорнай зямлі паднімала, першую малітву накладала, на сінім моры у белым камяшку вады даставала і ў гэтай вадзіцы скупала. Прашу-ж гэтаму дзіцяці за бабку благаслаўленьне даці анельскім словам і нізкім паклонам.

*Атказ*: Благаслаў Божэ!

5) Такжэ-ж ён просіць сваю хросную мамку і татку каторые яго пад хрост вазілі, у Бога долі і шчасьця прасілі, да папоў, ці да ксяндзоў успеяшчых, да сьвечак гарашчых і да званоў зьвіняшчых паднасілі. Прашу-ж гэтаму дзіцяці за хроснаго татку і мамку благаслаўленьне даці анельскім словам і нізкім паклонам.

*Атказ*: Благаслаў Божэ!

6) Такжэ ж ён просіць паноў-панятак і маленькіх дзіцятак, с кута да запечка, кожнаго чэлавечка. Прашу гэтаму дзіцяці благаслаўленьне даці анельскім словам і нізкім паклонам.

*Атказ*: Благаслаў Божэ!

7) Такжэ-ж ён просіць і тых бабылак, што не маюць ні кароў, ні кабылак, на сабе з лесу каторые дровы насілі у Бога яму долі і шчасьця прасілі. Прашу-ж гэтаму дзіцяці благаслаўленьне даці анельскім словам і нізкім паклонам.

*Атказ*: Благаслаў Божэ!

Са старой запісі (сярэдзіны XIX ст), падала

**Бронiслава Свiдэрская**

# Рэестр.

Янка Купала: Курган . . . . . 3
Тарас Гушча: Зло не заўсёды зло . 11
„ „ Родные зьявы . . 69
К. Лейко: Таклюся сухотніца . . 13
Максім Богданов чъ: Старая Беларусь . 22
А. Калпак: Думкі . . . . . 26
Л. Гвозд: Цмок . . . . . . 28
Алесь Гарун: Думкі ў чужыне . 33
„ „ Навакол . . 36
М. Кепскі: Рабы Міхась Крэчка, што быў за судзьдзю . . . . 38
Якуб Колас: Лесьнікова пасада . . 44
Я. Лёсік: Гэркулес і селянін . . 51
Ф. Чэрнышэвіч: Лета . . . 52
К. Буйло: * * * . . . . 53
Я. Журба: У летні вечэръ . . . 54
Змітрок Бядуля: Сон Анупрэя . , 55
» » Пяць лыжак заціркі . 59
Стары Ўлас: Тры злодзеі . . . 63
А. Гурло: Вечэр . . . . . 77
Б. Съв дэрская: Благаслаўленьне вясельнае . . . . . . 78

# Беларускіе кніжкі.

Кніжкі адзначэные зоркай *) друкаваны лацінскімі (польскімі) і рускімі літэрамі.

## I. Да навучаньня.

* Беларускі лемэнтар . . . . . . . . . . . 6 кап.
* Першае чытаньне. Цёткі . . . . . . . . . 6 „
Другое чытаньне, Коласа . . . . . . . 25 „
Karotki katechizm . . . . . . . . . . . 5 „

## II. Навуковые, даступные для ўсіх.

Гутаркі аб небі і зямлі з рысункамі . . . 15 кап.
* Цукер, В. Тройцы . . . . . . . . . 3 кап.
* Гутаркі аб гаспадарцы . . . . . . . . 3 кап.
* Як ратаваць уздутую жывёлу . . . . . 3 кап.
* Як бараніцца ад халеры . . . . . . . . 1 кап.
* Пшчэліна-жывела малая, а карысьці дае многа . . . . . . . . . . . . . 30 кап.
* Як рабіць добрые рамовые вульлі . . . . . 5 кап.
* Зямельная справа у Новай Зэляндыі . . . . 3 кап.
* Аб гаспадарцы на хутарох і шнурох . . . . 5 кап.
* Кароткая гісторыя Беларусі . . . . . . . 60 кап.
* Беларусы і іх нацыональнае адраджэньне . . . 5 кап.
* Як ужываць штучны навоз . . . . . . . 2 кап..
Як багацеюць чэскіе селяне . . . . . . . 10 кап
Маладая Беларусь спытак I (160 стр. . . . . 100 кап.
На дарозе да новаго жыцьця. А. Новіны . . . 20 кап.

## III. Повесьці і апаведаньне прозай.

Дым, Конопніцкай . . . . . . . . . . 6 кап.
Казкі . . . . . . . . . . . . . . 6 кап.
Беларускіе казкі (Чэлавечае вока і др.) . . . . 5 кап.
* Гэдалі, Э. Ожэшко. . . . . . . . . . 6 кап.
* Казка аб вадзе . . . . . . . . . . . 3 кап.
Архіп і Лявонка . . . . . . . . . . 8 кап.
Дзядзька Голад, Віткевіча . . . . . . . . 2 кап.
Хілібэртова пакута, Амфітеатрова. . . . . . 5 кап.
Вяроўка і др. Ядвігіна Ш. . . . . . . . . 5 кап.
Апаведаньня, Тараса Гушчы . . . . . . . . 10 кап.
* Зборнік „Нашай Нівы“ № 1 (80 стр.) . . . . 15 кап.
* Зборнік „Нашай Нівы‘ № 2 (80 стр.) . . . . . 20 кап.

## III. ВЕРШЫ.

| | |
|---|---|
| * Вязанка, Я. Лучыны . . . . . . . . . . | цэна 4 кап. |
| * Тарас на Парнасе . . . . . . . . . . | 5 „ |
| Дзед Завала, Ядвігіна Ш. . . . . . . . | 5 „ |
| * Снапок, зборнік вершоў А. Паўловіча . . . | 15 „ |
| Адвечная песьня, абразок у XII. зьявах Я. Купалы | 20 „ |
| А хто там ідзе. Песьня Янука Купалы з нотамі | 10 „ |
| Biełaruskije pieśni z notami. Sabrau A. Hryniewicz | 30 „ |
| Biełaruskije pieśni z notami. Sabrau A. Hryniewicz i A. Ziaziula . . . . . . . . . . . | 25 „ |
| * Беларускі песеньнік з нотамі . . . . . . . | 15 „ |
| Песьні жальбы, Якуба Коласа . . . . . . . | 30 „ |
| Huślar, zbornik werszou J. Kupały . . . . | 50 „ |
| Кацярына, Т. Шэвчэнка . . . . . . . . | 10 „ |
| Жалейка. Зборнік вершоу Я. Купалы . . . . | 50 „ |
| Pan Tadeusz, A. Mickiewicza pierekł. Marcinkiewicza . . . . . . . . . . . . . | 25 „ |
| Hapon, apowieść Marcinkiewicza . . . . . . | 15 „ |
| Wieczarnicy, apowieści Marcinkiewicza . . . . | 15 „ |
| Šperouskije dażynki, Kupała, Marcinkiewicza . . | 20 „ |
| Dudka bielaruskaja M. Buraczka . . . . . . | 25 „ |
| Smyk bielaruski S. Reuki . . . . . . . . | 20 „ |
| * Чыжык Беларускі. Гальяша Леучыка . . . . | 30 „ |

## БЕЛАРУСКІЕ ТЭАТРАЛЬНЫЕ ТВОРЫ.

| | |
|---|---|
| Модны шляхцюк, камэдвыя у I дзеі, Каганца | 25 к п. |
| У зімовы вечэр, Абраз Э. Оржэшко у 1 дзеі | 35 „ |
| Пашыліся ў дурні. Жарцік Крапіуніцкаго у 3 дзеях | 60 „ |
| Сватаньне. Жарцік Чэхова . . . . . . . . | 25 „ |
| Міхалка. Камэдыя у I дзеі Кропіуніцкаго . . . | 35 „ |

„Наша Ніва“ за гады:

| | |
|---|---|
| * 1906 . . . . . . . . . . . . . . . | 50 „ |
| * 1909 . . . . . . . . . . . . . . . | 2 р. 50 „ |
| * 1910 . . . . . . . . . . . . . . . | 2 р. 50 „ |
| * 1911 . . . . . . . . . . . . . . . | 2 р. 50 „ |
| * Беларускіе календары за 1911—1912 г. па . | — р. 15 „ |

---

Усе гэтые кніжкі можна выпісываць накладнэй платай праз Кантору Рэдакцыі „Нашэй Ніва“ (Вільня Завальная № 7)

1934

# Вышлі з друку:

| | R. | K. |
|---|---|---|
| ıdaja Biełaruś sszyt. II | 1 | — |
| ıdaja Biełaruś „ III | 1 | — |
| ькі слоу аб дзявочай апратцы на Беларусі | | 10 |
| Barszczeuski, pierszy biełaruski piśmiennik (Uspamin u 60-letniuju hadauszcz. śmierci) | | 20 |
| ядная пісанка | | 15 |
| ікодная пісанка | | 30 |
| ЗІГІН Ш. „Васількі (апаведаньня) | | 30 |
| ГОРЭЦКІ „Рунь“ (апаведаньня) | | 40 |
| РАС ГУШЧА „Родные з'явы (апаведаньня) | | 60 |
| „ „ „Неманоу дар“ | | 6 |
| „ „ „Тоустае палена“ | | 6 |
| УБ КОЛАС „Прапау чэлавек“ | | 6 |
| ЛУБОК „Апаведаньня“ | | 6 |
| ГВОЗД „Пракленашы“ | | 6 |
| УРУС „Аб чым шэпацелі лісьця“ | | 6 |
| KUB KOŁAS „Batrak“ | | 10 |
| ZKA HARTNY „Pieśni“ | | 15 |
| іч. Амэрыканец | | 10 |
| TROK BIADULA „Abrazki“ | | 15 |
| КА КУПАЛА „Шляхам жыцьця“ (зборн. вершоу) | 1 | 25 |
| „ „ „Сон на кургане“ у 4 абразах | | 5[illegible] |
| БОГДАНОВІЧ „Вянок“ (зборнік вершоу). | | 50 |
| БУЙЛО „Курганная кветка“ (зборн. вершоу) | | 25 |
| ЛЁСІК „Ня усе-ж разам ягомосьці“ (апавед.) | | 5 |
| ЕПКА БІРЫЛА „Стражнік“ (апавед.) | | 10 |
| ТРА БЕЛАРУС „Якім бяздольны“ (апавед.) | | 15 |
| ЕВ. ГАРШЫН: Сыгнал (апавед.) | | 5 |
| lendy i apawiedańnia wierszam roznych autarou | | 25 |
| рты | | 5 |
| ЭН Z NAMI“ biełaruski malitwienik u dobr. aprawie | | 50 |
| kolki słou ab pakuci | | 3 |
| Andrej Babola | | 5 |
| y dla matak jak hadawać dzieci na dobrych ludziej | | 3 |
| ahol (ab harełcy) | | 2 |

„Z rodnaho zahonu“ zbornik wierszau A. Ziaziuli .
„Miatawyje listoczki“ (dobryje apawiedańnia) .
„Życcio Papieża Piusa X“ . . . . . .
„Na szto biełarusam hazety“. . . . . .
„Betlejka“ . . . . . . . . .
„Czeławiek na wyszynie swajej hodnaści“ . .
„Kantyczka“ . . . . . . . .

# Кніжкі для школ:

Biełaruski lementar . . . . . .
Беларускі лемэнтар . . . . . .
Pierszaje czytańnie . . . . . .
Першае чытаньне . . . . . .
Hasciniec dla małych dzietak . . . .
Другое чытаньне . . . . . .
Karotki katechizm . . . . . .
Karotkaja historja świataja . . . . .
Karotkaje wyjaśnieńnie obradou R.-Katalickaho kaścioła .
Zadacznik dla paczatkowych szkoł . . .
Задачнік для пачатковых школ . . . .
Karotkaja historyja Biełarusi . . . .
Кароткая гісторыя Беларусі . . . .

# Для тэатроу:

„Паулінка“ камэдзія у 4 сцэнах. Я. Купалы . .
„Як яны жаніліся“ жарт Володськаго. . . .
„Хам“ абраз у 4 сцэнах. Э. Оржэшко . .
„Мядзьведзь“ жарцік Чэхова . . . .
„Па рэвізіі“ сцэна. Кропіуніцкаго . . .

B00000000223900